© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 56 (2416)
18 ліпеня 1969 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДАЎНЯЯ і моцная дружба звязвае беларускі і польскі народы. Дружба гэтая мацавалася на працягу стагоддзяў. Асабліва загартавалася яна ў суровыя гады другой сусветнай вайны, калі з ненавісным ворагам поплеч змагаліся, разам з іншымі народамі, беларусы і палякі. На нашай зямлі вечным сном спяць польскія салдаты, і дзяўчынкі з беларускіх вёсак прыносяць на іх магілы сінія званочкі і беласнежныя рамонкі. А на берагах Віслы і Буга стаяць помнікі савецкім салдатам, якія аддалі сваё жыццё «за нашу і вашу свабоду».

Адным з праяўленняў гэтай дружбы нашых народаў — дружба нашых літаратур, сяброўскія сувязі і кантакты паміж польскімі і беларускімі пісьменнікамі. Сёння, як ніколі, мы можам гаварыць аб плёне, які прыносіць дружба і ўзаемасувязь нашых літаратур. Сярод беларускіх чытачоў вялікай папулярнасцю карыстаюцца кнігі польскіх празаікаў і паэтаў. З вялікім поспехам на сцэнах нашых тэатраў ідуць п'есы польскіх драматургаў. А беларускую кнігу, у сваю чаргу, ведаюць і шануюць у Народнай Польшчы.

Яркім сведчаннем гэтай дружбы стануць дні польскай літаратуры, якія будуць праведзены ў нашай рэспубліцы з 22 ліпеня па 1 жніўня.

Напярэдадні іх адкрыцця карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва» гутарыў з намеснікам старшыні прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі В. Чарняўскай. Вось што яна расказала.

— Мы чакаем гасцей. Праз некалькі дзён да нас у Беларусь прыедуць дарагія і даўнія сябры — дзеячы літаратуры з Польскай Народнай Рэспублікі.

Вытокі польска-беларускіх літаратурных сувязей бяруць свой пачатак у далёкім мінулым. Сёння ж мне хочацца сказаць толькі пра тое, як цяпер развіваюцца ўзаемаадносіны паміж нашымі літаратурамі, паміж беларускімі і польскімі

СВЯТА СУСЕДЗЯЎ, СВЯТА СЯБРОЎ

НАПЯРЭДАДНІ ДЗЕН ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ

пісьменнікамі. Цяпер гэта не толькі ўзаемны абмен кнігамі, але і моцныя асабістыя сяброўскія кантакты.

Упершыню мы прымалі ў сябе групу польскіх пісьменнікаў гадоў пятнаццаць назад. Тады ж упершыню наведала Польшчу і дэлегацыя беларускіх літаратараў. У сяброўскіх сустрэчах прымалі ўдзел не толькі пісьменнікі, але і мастакі, спевакі, музыканты.

Гэтыя першыя ўзаемныя кантакты паказалі, што ў пісьменнікаў дзвюх братніх краін ёсць шмат агульнага, што ім ёсць пра што пагаварыць, аб чым параіцца альбо паспрачацца.

Як з маленькіх ручайкоў пачынаюцца вялікія рэкі, так і сувязі нашы, пачаўшыся з асобных, эпізадычных сустрэч, сталі сёння шырокія і рознабаковыя. Вось некаторыя моманты нашых узаемных літаратурных сувязей.

Беларускія чытачы праяўляюць вялікую цікавасць да польскай літаратуры — і да класічнай, і да сучаснай. На кніжных паліцах кнігарань і бібліятэк штогод з'яўляюцца новыя пераклады кніг польскіх пісьменнікаў. Гэта творы А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, Г. Сянкевіча, Б. Пруса, Э. Ажэшкі, С. Жаромскага, М. Канапніцкай, М. Жулаўскага, Ю. Тувіма, Л. Кручкоўскага, У. Бранеўскага, Е. Путраманта, К. Брандыса, М. Яструна. На беларускай мове выйшлі таксама творы У. Сыракомлі, Я. Крашэўскага і многіх іншых польскіх паэтаў і празаікаў.

Над перакладамі твораў польскай літаратуры працавалі такія нашы выдатныя пісьменнікі, як М. Танк, М. Лужанін, С. Дзяргай, Я. Брыль, П. Пестрак, К. Крапіва, М. Аўрамчык і іншыя нашы літаратары. Вялікую спадчыну перакладаў лепшых твораў польскай паэзіі і прозы пакінулі нам класікі беларускай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас.

У свой час вялікай, хвалюючай падзеяй у культурным жыцці беларускага і польскага народаў стаў выдадзены ў Польшчы польска-беларускі слоўнік, у рэдагаванні якога прымаў удзел старэйшы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства АН БССР, кандыдат філалагічных навук М. Бірыла.

Нядаўна выдавецтва «Беларусь» падрыхтавала да друку на беларускай мове зборнік апавяданняў польскіх пісьменнікаў «Ад Буга да Одэра». У бліжэйшы час зборнік выйдзе ў свет.

Дадам яшчэ, што на сцэнах беларускіх тэатраў усё часцей з'яўляюцца творы польскіх драматургаў. Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы паставіў у свой час п'есы «Дамы і гусары» Фрэдра, «Смерць ваяводы» Славацкага, «Зыбучыя пяскі» Хайноўскага і «Начная аповесць» Хаінскага, а тэатр імя Я. Коласа — «Мараль пані Дульскай» Запольскай. У тэатры юнага гледача з вялікім поспехам ішла п'еса Юргелевіча «Восем лялек і мядзведзь».

Значнай падзеяй у музычным жыцці рэспублікі была опера С. Манюшкі «Страшны двор», лібрэта якой так хораша пераклаў на беларускую мову М. Танк.

Спынюся на тым, што і творы беларускіх літаратараў не засталіся незаўважанымі польскімі калегамі. Яны пераклалі на сваю мову кнігі Я. Купалы, Я. Коласа, М. Лынькова, М. Танка, Я. Брыля, Т. Хадкевіча, П. Панчанкі, К. Кірэенкі, П. Пестрака, М. Лужаніна, В. Быкава, І. Шамякіна, І. Мележа, Р. Барадуліна і іншых пісьменнікаў.

Для ўдзелу ў днях польскай літаратуры ў Беларусь прыязджаюць дзве дэлегацыі — дэлегацыя Таварыства польска-савецкай дружбы і дэлегацыя польскіх літаратараў. Сярод іх — загадчык кафедры савецкай літаратуры Варшаўскага універсітэта крытык Фларыян Няўважны, рэдактар часопіса «Барвы» паэт Генрык Гаворскі, а таксама пісьменнікі з Варшавы, Катовіц, Аполя і іншых польскіх гарадоў.

Нашы госці пабываюць у Мінску, Навагрудку, Баранавічах, Гродна. Іх маршрут скіруецца і да памятнага мемарыяла ў Леніна Магілёўскай вобласці, дзе яны сустрэнуцца з жыхарамі навакольных вёсак — сведкамі незабыўных баёў Войска Польскага з германскім фашызмам. Пабываюць яны і на Кургане славы, у Хатыні.

Польскія госці наведаюць таксама запаветныя мясціны, звязаныя з жыццём і творчасцю А. Міцкевіча і Э. Ажэшкі.

Мы спадзяёмся, што многа цікавага прынясуць сустрэчы нашых гасцей з творчымі работнікамі рэспублікі, мінскімі трактарабудаўнікамі, студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Яны правядуць таксама ў клубе Саюза пісьменнікаў Беларусі творчы вечар-сустрэчу са сваімі беларускімі калегамі.

У Мінскім палацы спорту днямі адкрываецца выстаўка польскай кнігі, дзе дзесяткі тысяч мінчан змогуць пазнаёміцца з навінкамі сучаснай польскай літаратуры, з культурай паліграфічнага мастацтва нашых суседзяў.

Акрамя Мінска, вечар польскай паэзіі адбудзецца таксама ў Віцебску.

Спецыяльныя канцэртныя праграмы да дзён польскай літаратуры ў Беларусі рыхтуюць калектывы мастацкай самадзейнасці Мінскага трактарнага завода і Палаца культуры прафсаюзаў. Мінчане, у сваю чаргу, маюць магчымасць пазнаёміцца з мастацтвам польскага народа. У гэтыя дні ў сталіцы нашай рэспублікі знаходзіцца Цэнтральны мастацкі ансамбль Войска Польскага.

Хочацца спадзявацца, што сустрэчы беларускіх і польскіх літаратараў стануць сапраўдным святам братніх народаў, святам нашай дружбы.

В. САЛАЎЕЎ.

ГАРАЧАЕ АДАБРЭННЕ

Вынікам міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый быў прысвечан партыйны сход камуністаў творчых саюзаў і арганізацый рэспублікі, які адбыўся 16 ліпеня ў Мінску. З дакладам выступіў сакратар ЦК КП Беларусі С. Пілатовіч.

Выступіўшыя ў спрэчках рэдактар часопіса «Беларусь» М. Калачынскі, старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР, народны артыст СССР Р. Шырма, пісьменнік В. Хомчанка, сакратар партарганізацыі Саюза журналістаў БССР Б. Зельцэр, народны мастак БССР Я. Зайцаў гаварылі аб велізарным значэнні Нарады.

У рэзалюцыі сходу камуністы творчых саюзаў і арганізацый адзначаюць, што работа Нарады і прынятыя ёй дакументы знамянуюць сабой вялікі поспех міжнароднага камуністычнага руху ў яго барацьбе супраць імперыялізму, ва ўмацаванні адзінства дзеянняў камуністычных і рабочых партый, згуртаванні ўсіх антыімперыялістычных сіл. Сход рэкамендаваў усім творчым работнікам удасканальваць ідэйна-выхаваўчую работу сярод насельніцтва, выхоўваць савецкіх людзей у духу марксізма-ленінізма, пралетарскага інтэрнацыяналізму і савецкага патрыятызму, пачуцця гордасці за сваю партыю і краіну, гатоўнасці аддаць усе сілы для яе працвітання, разумення глыбока інтэрнацыянальнага сэнсу ўсіх нашых спраў, павагі да брацкіх партый, народаў сацыялістычных краін.

БЕЛТА.

НЯМА АБЫЯКАВЫХ ФІЛЬМАЎ

Ідуць апошнія дні VI Маскоўскага кінафестывалю. Яшчэ рывок, яшчэ — і будуць названы імёны тых, хто заваяваў ганаровыя прызы. Але не будзем забягаць наперад. «Дажывём да аўторка», 22 ліпеня, — як гаворыць кубінская актрыса Эслінда Нуньес, — калі журы выявіся свой вердыкт».

Пры ўсёй непадобнасці манер рэжысёраў розных краін, пры неаднолькавым таленце пастаноўшчыкаў — фільмы, якія ідуць на фестывалі, аб'ядноўвае нешта агульнае — актыўнасць пазіцыі кінамайстроў. Тут няма абыякавых мастакоў, няма абыякавых фільмаў.

Ужо карацюпенькі пераказ некаторых фільмаў можа пацвердзіць гэтую думку.

Аргенцінскі фільм «Вузкая палоска неба» рэжысёра Давіда Хасэ Каона можна было б назваць камерным, калі б сумная гісторыя кахання двух падлеткаў не дала нам магчымасці ўбачыць жыццё грамадства, у якім так мала шчасця для юных Дэліі і Пакіта.

На мінулым маскоўскім фестывалі з вялікім поспехам прайшла стужка мангольскага рэжысёра Д. Жыгжыда «Паводка», якая была адзначана ўзнагародай. На гэты раз рэжысёр прадстаўляе сваю краіну гісторыка-рэвалюцыйным фільмам «Раніца», прысвечаным заснавальніку Мангольскай Народнай Рэспублікі Сухэ-Батору. «Раніца» — гэта зара новага жыцця ў Манголіі, здабытага ў жорсткіх баях з ворагам, і гэта першыя крокі маладой народнай улады, якая завявала аўтарытэт у простых людзей. Хвалююць кадры, якія паказваюць гістарычную сустрэчу Сухэ-Батора і У. І. Леніна. Выканаўцы гэтых роляў П. Дашнамжыл і Юрый Каюраў здолелі перадаць узнёслую атмасферу дружбы мангольскага і савецкага народаў, рэвалюцыйны пафас тых векапомных дзён...

Бескампрамісны, поўны драматызму фільм прадставіў на фестываль буйнейшы майстар японскага кіно Тадасі Іман «Рака без моста» — пра «занядбаных» у Японіі.

А карціна югаслаўскіх кінематаграфістаў «Калі чуеш званы» рэжысёра Антуана Врдоляка расказвае, як вайна прыходзіць на зямлю югаслаўскіх сялян і як яны ўздымаюцца на барацьбу.

Усіх карцін не толькі не перакажаш, але і не пералічыш. Трэба думаць, што ў бліжэйшы час найбольш цікавыя з іх мы ўбачым на экранах нашых кінатэатраў і па тэлебачанні.

Праўда факта прыкоўвае ўвагу гледачоў, хвалюе. Дакументальныя кінастужкі прыцягваюць не менш, чым мастацкія фільмы. У гэтых фільмах — летапіс планеты. Востры, іранічны, пабудаваны на сацыяльных кантрастах англійскі фільм «Парад» (рэжысёр Рэк Хіл). Пра трагічны лёс баксёра расказваецца ў маляваным італьянскім фільме «К. О.» (рэжысёр М. Манфрэдзі). Цэйлонскія кінематаграфісты паказалі стужку «Сыны даліны», у якой расказваецца пра тое, як змяняецца жыццё, дзякуючы асваенню ракі Кал Ойя (аўтар сцэнарыя і рэжысёр Д. Б. Нігалсінге).

У дні маскоўскага фестывалю наладжаны спецыяльны паказ фільмаў паўднёва-в'етнамскай студыі «Вызваленне». Кожны кадр — гэта імгненні гераічнай барацьбы народа за вызваленне. Гэта фільмы аб мужнасці салдат арміі вызвалення, жанчын, дзяцей, якія ўпэўнены ў перамозе справядлівасці. Іншая справа — амерыканскія салдаты, якія прыйшлі на зямлю В'етнама, як захопнікі і гвалтаўнікі.

Прагляды, прагляды, прагляды... Але побач, можна сказаць — паралельна, ідуць знаёмствы. Такія, якія магчыма потым застануцца на ўсё жыццё, і кароткія, усяго на некалькі слоў.

70 краін свету, сотні непаўторных мастакоў і нібыта адзіны подых людзей, задумы якіх укладзены ў кароткі дэвіз: «За гуманізм кінамастацтва, за мір і дружбу паміж народамі».

Такі VI Маскоўскі.

Плакат мастака Л. Замаха, які атрымаў заахвочвальную прэмію на рэспубліканскім конкурсе на лепшы плакат, прысвечаны У. І. Леніну і Камуністычнай партыі.

НА КІНАЭКРАНАХ — РОДНАЯ ПРЫРОДА

Немагчыма ўявіць родную Беларусь без яе венавых дуброў і бярозавых гаёў, без вечна зялёных елак і стромкіх мачтавых сосен, без блакітнай гладзі шматлікіх азёр і рэк з іх разнастайнасцю жывёльнага свету.

Вясной і ўлетку над палямі і лясамі не змаўкае спеў птушак. У поймах азёр і рэк гнездзяцца качкі, шэрыя гусі, белапенныя лебедзі, над балотнымі прасторамі курлыкаюць журавлі, селяцца чорныя буслы. У нашых лясах не рэдкасць глушцы, цецярукі, рабчыкі. Паводле падлікаў вучоных, у нас налічваецца каля 300 відаў птушак, больш за 50 відаў рыб і больш як дзвесце відаў пазваночных жывёл. У запаведных лясах Белавежы і Беразіны жывуць магутныя зубры і прыгажуны-ласі, вяпрукі і мядзведзі, бабры і яноты, норка і куніца.

Як зберагчы і памножыць вялікія нацыянальныя багацці? Гэтаму прысвечаны распубліканскі фестываль кінафільмаў аб прыродзе роднага краю. Ён праводзіцца Дзяржаўнымі камітэтамі Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі і ахове прыроды ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна і будзе працягвацца да 1970 года.

Перад пачаткам дэманстрацыі кінакарцін перад гледачамі выступаюць члены Таварыства аховы прыроды, работнікі лясной гаспадаркі, біёлагі.

Тысячы аматараў прыроды Гродна, Бабруйска, Слуцка, Барысава, Жлобіна, Быхава і многіх іншых гарадоў пазнаёміліся з навукова-папулярнымі і хранікальна - дакумента л ь н ы м і фільмамі беларускіх кінематаграфістаў «Блакітныя вочы зямлі», «Белавежская пушча», «Лясны эцюд», «Па Прыпяці», «Сведкі вечнасці», «Вярэскі запаведнік», «Блакітная цаліна», «Бацька-Нёман» і іншымі кінастужкамі, якія раскрываюць харастно роднай прыроды.

У налгасе імя Леніна Стаўбцоўскага раёна за дні фестывалю было паказана 18 фільмаў аб прыродзе і яе ахове.

Цяпер фестываль прыйшоў у клубы і дамы культуры Лідскага, Смаргонскага, Навагрудскага і іншых раёнаў рэспублікі. Акрамя карцін беларускіх кінематаграфістаў у час юбілейнага фестывалю дэманструюцца мастацкія, кароткаметражныя і мультыплікацыйныя фільмы маскоўскіх, ленінградскіх, свярдлоўскай, талінскай, яліцінскай, адэскай, ерэванскай і іншых кінастудый краіны, а таксама фільмы многіх замежных краін.

С. ВАНІН.

БІБЛІЯТЭЦЫ — 70 ГАДОЎ

Аршанскай цэнтральнай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна споўнілася 70 гадоў. Яна была створана на сродкі інтэлігенцыі горада і адыграла вялікую ролю ў абуджэнні рэвалюцыйнай свядомасці людзей, іх выхаванні. У 1907—1908 гадах членам савета бібліятэкі быў вядомы рэвалюцыянер П. М. Лепяшынскі. Ён хаваў у яе памяшканні і распаўсюджваў сярод чытачоў бальшавіцкую літаратуру.

За гады Савецкай улады бібліятэка значна вырасла. Цяпер у ёй налічваецца больш як 80 тысяч тамоў розных літаратуры. Паслугамі бібліятэкі карыстаецца звыш 8 тысяч чалавек.

У гэтыя дні яна дзейна рыхтуецца да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. У чытальнай зале адкрыты тэматычныя выстаўкі, прысвечаныя знамянальнай даце. Бібліятэка адной з першых на Віцебшчыне ўключылася ў грамадскі агляд, прысвечаны ленінскаму юбілею.

БЕЛТА.

ПЕРАД ВЯЛІКАЙ ДАРОГАЙ

Закончыліся выпускныя экзамены. Новы вялікі атрад маладых спецыялістаў папоўніў прафесіянальныя і самадзейныя мастацкія калектывы, культурна-асветныя ўстановы рэспублікі.

Вось што расказалі нашаму карэспандэнту ў некаторых навучальных установах, якія рыхтуюць для рэспублікі кадры работнікаў мастацтва і культуры.

159 ПУЦЁВАК

«Захоўвайце цішыню — ідуць прыёмныя экзамены!» — гэтыя надпісы можна цяпер убачыць на дзвярах многіх класаў і вучэбных аўдыторый Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А. В. Луначарскага.

А пакуль ідуць прыёмныя экзамены, у вучэбнай частцы і аддзеле кадраў шумна. Тут выпускнікі атрымліваюць пуцёўкі ў вялікае самастойнае жыццё. Іх 159 — музыкантаў, спевакоў, дырыжораў, будучых кампазітараў. Многія з іх папоўняць рады педагогаў музычных вучылішчаў рэспублікі, будуць працаваць у Беларускім тэатры оперы і балета, у Белдзяржфілармоніі, а некаторыя застануцца пры кансерваторыі.

У тэатр оперы і балета атрымалі накіраванне вакалістка А. Атлыгіна, піяністка С. Арлова, скрыпач Д. Яканюк, віяланчэліст Р. Крычкер і выпускнік аддзялення харавога дырыжыравання Г. Луцэвіч.

Выпускнікі В. Хадына і В. Лагвіненка (скрыпка), Я. Пукст (фартэпіяна), В. Рэватка (альт) і некаторыя іншыя запрошаны ў Белдзяржфілармонію. Дарэчы, сярод выпускнікоў кансерваторыі ў гэтыя дні можна ўбачыць і салістку Беларускай дзяржаўнай філармоніі Інэсу Адзінцову. Работу ў філармоніі яна спалучала з вучобай на аддзяленні спеваў і вось цяпер атрымала дыплом аб вышэйшай музычнай адукацыі.

Фартэпіяна, струнныя, духавыя, народныя інструменты, харавое дырыжыраванне — вось далёка не поўны пералік спецыяльнасцей, якія атрымалі былыя студэнты кансерваторыі.

ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ

Прайшлі напружаныя гады вучобы. І вось ужо ў каторы раз педагогі Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага вучылішча гавораць сваім новым выхаванцам:

— Бывайце, сябры. Поспехаў вам у вялікім і высакародным мастацтве!

На гэты раз вучылішча скончыла 25 юнакоў і дзяўчат. Усе яны на выпускных экзаменах паказалі добрыя харэаграфічныя здольнасці.

У Мінску, у тэатры оперы і балета будуць працаваць Л. Цярэнцьева, С. Свірыдава і М. Самалазаў. В. Раеўская, Н. Шыловіч, Г. Платонава і Л. Пілат папоўнілі харэаграфічную групу Дзяржаўнага народнага хору БССР.

Група выпускнікоў вучылішча атрымала накіраванне ў Чэлябінскі і Львоўскі тэатры оперы і балета, у Ленінградскі мюзік-хол, у Белдзяржфілармонію і Магілёўскі абласны тэатр музычнай камедыі.

ПА ЗАЯЎКАХ АДДЗЕЛАЎ КУЛЬТУРЫ

Яшчэ задоўга да дзяржаўных экзаменаў у Магілёўскае культасветвучылішча пачалі паступаць заяўкі на выпускнікоў ад абласных, гарадскіх і раённых аддзелаў культуры. У іх называлася прозвішчы кіраўнікоў самадзейных тэатральных калектываў С. Мянчынскай, Л. Сапега, Л. Суховіцкай, У. Дашкевіча, харавікоў С. Калачовай, В. Сікор, Г. Пашковай, а таксама многіх выпускнікоў харэаграфічнага аддзялення, якія добра зарэкамендавалі сябе ў час пераддыпломнай практыкі.

Па даўняй традыцыі выпускнікі гэтага вучылішча перад атрыманнем дыпломаў пайгода працуюць у раённых і сельскіх дамах культуры, у клубах рэспублікі. Там яны ў гэты час чэруюць харавымі, драматычнымі і танцавальнымі калектывамі мастацкай самадзейнасці, на практыцы прымяняюць атрыманыя веды.

160 выпускнікоў сёлета ўзначаляць клубы, дамы культуры і калектывы самадзейнасці ў многіх раёнах, калгасах і саўгасах Магілёўскай, Мінскай, Гомельскай і іншых абласцей рэспублікі.

Чарговы выпуск супаў з 40-годдзем вучылішча. За гэты час стараэйшая навучальная ўстанова дала армію байцоў культурнага фронту каля сямі тысяч чалавек з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.

Сёлета тут на дзённае і завочнае аддзяленні будзе прынята 330 чалавек.

СА СЦЕН БРЭСЦКАГА МУЗЫЧНАГА

Выпускнікоў Брэсцкага музычнага вучылішча можна сустрэць у Маскве і ў Мінску, у Кіеве і ў Новасібірску, у Львове і ў Шахтах. За пасляваенныя гады музычную ўстанову скончыла каля тысячы чалавек.

На гэты раз пуцёўку ў жыццё тут атрымалі 70 чалавек. З іх пяцёра ўдастоены дыпломаў з адзнакай. Гэта — выпускніца тэарэтычнага аддзялення Н. Бурлакова, выпускнікі аддзялення фартэпіяна — Н. Касцюк, Л. Лахно, Л. Эйдліна і студэнтка класа віяланчэлі Г. Гурніна. З выпускнікоў дзённага аддзялення 16 чалавек экзаменацыйная камісія рэкамендавала ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю.

Наогул, экзамены тут прайшлі паспяхова. Аб гэтым сведчыць той факт, што з сямідзесяці студэнтаў-выпускнікоў 60 чалавек атрымалі па сваіх спецыяльнасцях адзнакі «выдатна» і «добра». Яны займаліся на сямі аддзяленнях — харавога дырыжыравання, фартэпіяна, вакальным, струнным, тэарэтычным, духавым і аддзяленні народных інструментаў.

Усе выпускнікі атрымалі накіраванні ў музычныя школы, палацы і дамы культуры Брэстчыны.

А некалькі выпускнікоў вакальнага аддзялення папоўняць Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу БССР.

БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ

ФУНКЦЫЯНАЛЬНА, ПРЫГОЖА, СУЧАСНА

Ці ж не праўда, гэты пяцідзесяціметровы гмах, у якім будуць працаваць больш за тысячу канструктараў-станкабудаўнікоў СКБ-12, выглядае вельмі лёгкім, нават нейкім празрыстым?..

Паглядзіце яшчэ раз на здымак...

Эфект лёгкасці дасягнуты дзякуючы таму, што вялікая плошча фасада пакрыта шклом, удала знойдзены прапорцыі будынка. Гарызанталі і вертыкалі — супрацьсонечныя бетонныя рэбры—падкрэслена канструктыўныя. Адчуванне лёгкасці, прыяўзнятасці будынка дасягаецца яшчэ і таму, што шматметровы «брусок» СКБ па фасадзе абапіраецца на некалькі калон, якія будуць аздоблены чорнай пліткай. Дарэчы, сучасныя аддзелачныя матэрыялы вельмі багата будуць ўжывацца для аздаблення як фасаду, так і інтэр'еру будынка...

Архітэктары І. Боўт, В. Дудкін, інжынер А. Эльтэрман падбалі і пра тое, каб будучым гаспадарам СКБ-12 працавалася прыемна і зручна. Яны прадугледзелі, здаецца, усё, што патрэбна канструктару — памяшканні будуць не вельмі вялікія, утульныя, у іх будзе шмат святла і паветра. Тут жа размесцяцца сталовая, цырульня. Плоскі дах другога паверха можна будзе выкарыстоўваць для адпачынку.

Ёсць у праекце і некалькі спецыфічных асаблівасцей. Перш за ўсё тое, што «мазгавы трэст» СКБ будзе непасрэдна спалучаны з вытворча-эксперыментальнымі цэхамі, якія размесцяцца ў вялікім паралелепіпедзе ззаду галоўнага корпуса.

Будынак СКБ-12 (яго ўжо пачалі ўзводзіць на рагу вуліц Пуліхава і Смаленскай) стане архітэктурнай дамінантай усёй планіроўкі навакольнай зоны.

У. СЯЛІЦКІ.



ЛЕНІНІЯНА Ў ГРАМЗАПІСЕ

Хто не адчувае хвалявання, слухаючы жывы голас Леніна! Праз далечынь гадоў даўшоў ён да нас і будзе гучаць для нашчадкаў. У гочар 100-годдзя з дня нараджэння правадыра Усесаюзная фірма «Мелодыя» падрыхтавала новы гукавы альбом усіх прамоў і выступленняў Ільіча, што ёсць у запісе, ілюстраваны фотадакументамі і рэдкімі фотаздымкамі.

Нязменнай папулярнасцю карыстаецца альбом «Старонкі жыцця У. І. Леніна», як складаецца з дзвюх доўгаіграючых пласцінак. Тут слухачы знойдуць успаміны сяброў і паплечнікаў вялікага правадыра, тых, хто меў шчасце працаваць з ім — Н. К. Крупскай, Е. М. Ярасла ўскага, А. Д. Стасавай, Ф. Я. Кона, У. Д. Бонч-Бруевіча, В. А. Карпінскага, выступленні М. І. Калініна, Г. М. Кржыжаноўскага, Г. К. Арджанікідзе, а таксама ўрыўкі з твораў літаратуры і мастацтва, якія ўвасабляюць любімы вобраз. Кампазіцыі фанаграмкінафільмаў «Ленін у Кастрычніку» і «Ленін у 1918 годзе» прыгадваюць незабыўны час Кастрычніцкага штурму, першыя суровыя гады Краіны Саветаў.

У грамзапісе прагучаць часткі 11-й і 12-й сімфоній Д. Шастаковіча, паэмы У. Маякоўскага «У. І. Ленін» і «Добра» ў выкананні А. Астангава. У альбом уключаны таксама ўспаміны К. П. Пешкавай аб сустрэчах Леніна і Горнага, расказ заснавальніка савецкай літаратуры пра Лонданскі з'езд РСДРП, які чытае артыст У. Давыдаў.

Грамафонныя юбілейныя пласцінкі папоўнены выступленнямі відных савецкіх дзеячоў жывых дзеячоў М. В. Крыленкі, А. В. Луначарскага, М. Г. Падвойскага, А. М. Каланцай, Л. Б. Красіна, А. Г. Шліхтэра, Д. І. Курскага, М. А. Сямашкі, Г. І. Пятроўскага, прамовамі відных дзеячоў міжнароднага рэвалюцыйнага руху.

Надзвіча шырокія і разнастайныя былі мастацкія інтарэсы Ільіча. На грампласцінцы «Музыка ў жыцці У. І. Леніна» запісаны яго любімыя рускія народныя і рэвалюцыйныя песні «Дубінушка», «Назаві мне такую мясціну», «Варшавянка», «Смела, таварышы, у нагу», «Інтэрнацыянал», фрагменты «Апасіянаты» Бетховена, 4-й і 5-й сімфоній Чайкоўскага.

Серыя пласцінак «Па ленінскіх месцах» правядзе вас па залах Цэнтральнага музея У. І. Леніна, раскажа аб яго кабінеце ў Смольным, кватэры ў Крамлі, доме ў Горках, стане вашым экскурсаводам па Ульянаўску — радзіме Ільіча.

Спецыяльны раздзел пласцінак прысвечаны вобразу У. І. Леніна ў мастацкай літаратуры. Вялікім тыражом выпушчаны камплекты запісаў лепшых драматычных і музычных спектакляў пра Ільіча Сярод іх п'есы «Чалавек з ружжом», «Крамлёўскія куранты», «Трэцяя патэтычная» М. Пагодзіна, «Праўда» А. Карнейчука, «Шторм» У. Біль-Белацаркоўскага, «Браняпоезд 14-69» У. Іванова, «Любоў Яравая» К. Трэнёва, «Неспакойная старасць» Л. Рахманава.

Старонкі музычнай Ленініяны ўключаюць многа твораў нашых кампазітараў, натхнёных светлым вобразам Ільіча. Гэта аратопія А. Лемана «Ленін», кантата М. Чуркі «Ленін і мы», драматычная сімфонія В. Шабаліна «Ленін» (па паэме У. Маякоўскага), ода А. Хачатурана «Памяці Леніна», кантата Д. Кабалеўскага «Ленінцы», «Патэтычная арапорыя» Г. Свірыдава, фрагменты з опер «Настрыніна» і «Вялікая дружба» В. Мурадэлі, «Арсенал» Г. Майбарады і іншыя.

Паэтычная Ленініяна, пачатая вялікім паэтам рэвалюцыі У. Маякоўскім, уключае пласцінкі з творамі Д. Беднага, У. Лугаўскога, І. Сяльвінскага, сучасных савецкіх і зарубежных паэтаў.

М. КАВАЛЬЧУК.

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

СЮДЫ НЕ ЗАРАСЦЕ НАРОДНАЯ СЦЯЖЫНА...

НЕДАЛЁКА ад цэнтра Віцебска, сярод зялёных прысад на высокім беразе Заходняй Дзвіны — невялікі аднапавярховы дом. Тут нядаўна адкрыты мемарыяльны музей камандзіра Першай беларускай партызанскай брыгады, Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова.

Далёка за межы Беларусі пайшла слава пра легендарнага бацьку Міная, партызанскага важака ў гады Вялікай Айчыннай, а ў мірны час — народнага дэпутата. Да яго ішлі за парадай і дапамогай, з ім дзяліліся і радасцю і горам.

Знаёмячыся з экспазіцыяй музея, уяўляеш увесь жыццёвы шлях гэтага чалавека. Жыццё Міная Шмырова знітавана з жыццём Віцебшчыны і ў гады станаўлення Савецкай улады, і ў гады грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, і ў пасляваенны час.

...Вось «вытокі» гэтага жыцця. Макет драўлянага домiка, у якім нарадзіўся і жыў у дзяцінстве Мінай Шмыроў. Побач — малюнак Г. Шутава «М. П. Шмыроў сярод батракоў у маёнтку Пудаць». Шматлікія матэрыялы пра ўстанаўленне Савецкай улады на Віцебшчыне, сярод якіх — фотакопіі асабістых дакументаў М. Шмырова тых далёкіх гадоў — мандат Суражскай калегіі па барацьбе з дэзерцірствам, прызначэнне камандзірам аддзялення, загад аб узнагароджанні ордэнам Чырвонага Сцяга і імянным гадзіннікам.

Пасля разгрому контррэвалюцыянераў і інтэрвентаў Мінай Шмыроў працуе спачатку дзесятнікам, пасля прарабам, старшынёй калгаса, дырэктарам Пудацькай кардоннай фабрыкі. І мы добра разумеем, чаму гэты чалавек стаў на чале першага партызанскага атрада на Віцебшчыне, створанага 9 ліпеня цяжкага сорак першага, калі нашы войскі пасля жорсткіх баёў пакінулі Віцебск.

Фатаграфіі і дакументы музея красамоўна расказваюць пра «новы парадак», прынесены фашыстамі на Віцебшчыну: разбураны горад, тысячы забітых савецкіх людзей, шыбеніцы, лагеры смерці, душагубкі.. У кожным паведамленні акупантаў слёзы і кроў — расстраляна 22 чалавекі, расстраляна 58, расстраляна 41...

Фатаграфіі і дакументы знаёмяць нас з першымі байцамі шмыроўскага атрада. У вітрынах— партызанская зброя: вінтоўкі, аўтаматы, мінамёт, станковы кулямёт...

Карціна мастака П. Явіча «Заложнікі» — пра шмыроўскую трагедыю. У чаканні смяротнага часу дзеці, сястра Міная — фашысты ўзялі іх заложнікамі... Дачка Ліза пісала бацьку з фашысцкага засценка: «Тата, за нас не хвалюйся. Нікога не слухай і да немцаў не ідзі. Калі цябе заб'юць, мы бяссільныя і за цябе не адпомсцім, а калі нас заб'юць, тата, ты за нас адпомсціш...»

Так, бацька Мінай адпомсціў за смерць дзяцей. Адпомсціў за смерць многіх савецкіх людзей.

Хіба можна знайсці словы, каб расказаць пра музейную карту, на якой — трагедыя Віцебшчыны: лагеры смерці, створаныя фашысцкімі захопнікамі!.. Хіба можна без хвалявання глядзець на мемарыяльную калону тым, хто не дажыў да светлага дня Перамогі!.. Тут, на гэтай калоне, сярод многіх імёнаў народных мсціўцаў і імёны партызан Першай беларускай брыгады: Героя Савецкага Саюза М. Сільніцкага, М. Сіманькова, І. Фёдарава, П. Галубінскага...

Пераходзім у другую залу. Шэраг экспанатаў — пра важную для жыцця партызанскай рэспублікі падзею — пленум ЦК КП(б)Б 26 — 28 лютага 1943 года ў Маскве. Гэты пленум намеціў канкрэтную праграму пашырэння партызанскага руху ў Беларусі да маштабаў усенароднай вайны.

Невыпадкова спецыяльны раздзел экспазіцыі прысвечаны сувязі партызан з Вялікай зямлёй. Гэта ж менавіта яны, шмыроўцы, стварылі славутыя Віцебскія вароты для пастаяннай сувязі партызан з Масквой!..

Гісторыя партызанскага атрада М. Біруліка — першаасновы Першай Віцебскай брыгады... Баявы шлях брыгады імя ВЛКСМ, створанай на базе атрада Д. Райцава... Дапамога партызан Віцебшчыны Савецкай Арміі ў вызваленні роднай зямлі... Віцебск вызвалены... Пра ўсё расказваюць экспанаты.

Завяршае экспазіцыю другой залы маляўнічае пано, створанае мастаком В. Ральцэвічам. Героі пано — рабочыя, сяляне, воіны, дзеці. Усе яны ўнеслі ўклад у перамогу. У гэтым — галоўная думка твора. Каля пано — галерэя герояў: скульптурныя бюсты герояў-партызан, сцягі партызанскіх брыгад Віцебшчыны...

Падрабязна паказана ў музеі дзейнасць Міная Шмырова пасля вайны. Мы бачым дэпутацкі блакнот Міная Шмырова, яго працоўную кніжку, матэрыялы пра святкаванне 70-годдзя бацькі Міная ў 1961 годзе, газету «Віцебскі рабочы» за 5 ліпеня 1964 года з паведамленнем пра абранне Міная Піліпавіча Шмырова ганаровым грамадзянінам Віцебска.

Урадавыя ўзнагароды бацьку Мінаю, яго баявыя і працоўныя ордэны і медалі... Пісьмы з усіх канцоў неабсяжнай Радзімы... І фатаграфіі, фатаграфіі—з баявымі сябрамі дома, з піянерамі ў школе..

Нарэшце, дакументы і здымкі пра той дзень 3 верасня 1964 года, калі бацькі Міная не стала...

Ён ляжыць на Успенскай горцы, на высокім беразе Заходняй Дзвіны, у Скверы Герояў, побач з тымі, што аддалі жыццё за свабоду Айчыны... На магілах герояў заўсёды кветкі...

І гэтыя кветкі, і новы музей на Віцебшчыне — сведчанне невыказнай любові да бацькі Міная, чыё імя вечна будзе жыць у народзе...

Хіба не пра гэта сведчаць і спектаклі, песні пра легендарнага партызанскага важака, і прысвечаныя яму кнігі, карціны, партрэты, малюнкі, паштовыя маркі, і спецыяльныя спартыўныя мемарыялы ў яго гонар, і названыя імем бацькі Міная саўгас, вучылішча!..

Побач з будынкам музея — мемарыяльны комплекс — своеасаблівы працяг экспазіцыі. Тут устаноўлены скульптурны партрэт Міная Шмырова, створаны З. Азгурам. Аўтар комплексу — віцебскі архітэктар З. Озерава.

Ты выходзіш з музея, поўны ўражанняў ад яркага жыцця бацькі Міная і яго аднадумцаў. Ты думаеш з удзячнасцю пра тых, што з вялікай любоўю стварылі гэты цудоўны музей: пра дырэктара І. Сіманькова, навуковага супрацоўніка Г. Сматракова, галоўнага мастака Б. Кузьмічова, мастакоў Л. Дзягілева, І. Хіцько, В. Ральцэвіча і многіх іншых. Пра савет ветэранаў, у які ўваходзяць былыя камандзіры і палітработнікі часцей Першай беларускай партызанскай брыгады Р. Шкоэда, Д. Райцаў, М. Бірулін і іншыя. Пра камсамольцаў Віцебска, якія памагалі стваральнікам музея.

Кожны, хто ужо наведаў музей, пакідае яго з ясным усведамленнем: так, сюды не зарасце народная сцежка...

А. ПАДЛІПСКІ.

Віцебск.

ПРА ТЫХ, КАГО НЕ БАЧЫЦЬ ГЛЯДАЧ

ЯГО КАПІТАНСКІ МОСЦІК



АДЗІН з заключных этапаў работы над фільмам — перазапіс. Гэта складаны працэс, калі зводзіцца на адну плёнку ўсё — ад рэплік да музыкі. Апошняе, рашаючае слова на гэтым этапе належыць гукааператару.

На перазапісах насычанага, складанага ў гукавым вырашэнні мастацкага фільма «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка» паводле рамана У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» гукааператар быў заняты некалькі дзён запар. І мы змаглі пагутарыць з Барысам Аляксандравічам Шангіным толькі ў перапынках. Потым святло гасла, і я зноў бачыў Шангіна на яго капітанскім мосціку — за шырокім пультам у зале гуказапісу. Ён запісваў гаворку, шумы, музыку. Усё гэта трэба было ўкласці сінхронна з адлюстраваннем на экране, звіць у пэўнай паслядоўнасці і камбінацыях на адну плёнку.

Барыс Шангін працуе на студыі «Беларусьфільм» некалькі гадоў, удзельнічаў у стварэнні многіх дакументальных і хранікальных фільмаў, а таксама мастацкіх — «Каханая», «Іду шукаць», «Саша-Сашанька». Шангіна запрашалі розныя рэжысёры, і ўсе яны гавораць адно: Шангін — вопытны спецыяліст, мастак вялікай слыхавой і музычнай культуры... «Слыхавая культура» — вызначэнне крыху дзіўнае.

Гэта ўменне чалавека з хаосу крыкаў, стралянiны, воклічаў, шэпту, плёскату выбраць мастацкую камбінацыю гукавых спалучэнняў, патрэбных для гэтага кадра.

Напружаныя гадзіны за пультам — гэта ўжо фінал, канец. А з чаго гукааператар Барыс Шангін пачынае сваю работу над фільмам?

Барыс Аляксандравіч вымае некалькі тоўстых папак. У іх сабраны розныя запісы, паметкі, ноты... А вось, бадай, найбольш цікавыя матэрыялы — гукавая інтэрпрэтацыя, распрацоўка сцэнарыя. Напісаць такі сцэнарый, уявіць, загадзя **пачуць** увесь ад пачатку да канца фільм — задача, безумоўна, не з лёгкіх.

Гукавыя распрацоўкі пачынаюцца да пачатку здымак. Наступны этап — здымкі на натуры і ў павільёнах. Магнітафоны ўключаны, запіс тэксту, рэплік, шумаў ідзе няспынна.

Папярэднія матэрыялы Шангін называе зыходным, фонавым назапашваннем, у якім сабраны знойдзеныя загадзя гукавыя рашэнні кінакадраў. Гэты матэрыял служыць гукааператару для пастаянных пошукаў новых гукавых спалучэнняў. Вядомы з вопыту работы над фільмамі і іншы прыём, калі акцёрам проста неабходна выкарыстанне загадзя падабранай, запісанай музыкі для эмацыянальнай зарадкі. У такіх выпадках музыка, гук пярвічныя — яны нібы адна з умоў, якая садзейнічае стварэнню фільма. Так, напрыклад, амаль уся камедыя «Саша-Сашанька» рэжысёра Віталія Чацверыкова здымалася пад фанаграму, пад загадзя запісаную музыку. Урачыстае, велічнае шэсце апосталаў па воблаках у фільме «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка» таксама здымалася пад музыку, дарэчы, створаную самім жа Б. Шангіным.

На месцы, у экспедыцыях, ідзе, як правіла, запіс і ўсіх фонавых гукаў — шум ручая, дрэва, выццё ветру, стрэлы і інш. Гэтыя запісы, дапрацаваныя, «ачышчаныя», уваходзяць у канчатковы варыянт фанаграмы. І тут ад гукааператара зноў-такі патрабуецца пачуццё меры, густ, а часам і проста кемлівасць: бывае ж гук трэба не толькі адшукаць, падабраць, але і стварыць.

Шангін успамінае, напрыклад, выпадак, як шукалі гукавое суправаджэнне для сцэны пажару на касмадроме ў фільме «Іду шукаць». Кадры найвышэйшага напружання — пацёк бак з кіслатой, вось-вось будзе выбух, людзі бягуць... Як жа гэты эпізод узмацніць гукам? Спробы падагнаць музыку не задавальнялі гукааператара.

Рашэнне прыйшло нечакана: суправаджэннем для сцэны пажару, які задаволіў і рэжысёра Ігара Дабралюбава, і гукааператара, аказаўся падслуханы рэзкі, пранізлівы свіст дымавой шашкі, кінутай у каменны дымаход. Запіс гэтага свісту на плёнцы запаволілі, расцягнулі—і атрымаўся трывожны густы гук-свіст, які, бадай, і немагчыма сыграць на якім-небудзь музычным інструменце. Такія і іншыя нечаканыя знаходкі і даюць права рэжысёрам і апаратарам называць Барыса «кампазітарам гука» і гаварыць пра яго «слыхавую культуру».

Знаходзіць, калі гэта патрабуе змест сцэны, гукі з непазнавальнымі тэмбрамі раіў яшчэ С. Эйзенштэйн. Ёсць такія кадры, напрыклад, у яго вядомым фільме «Аляксандр Неўскі», гэта хаця б эпізод спальвання немаўлят, які суправаджаецца змененым, дэфармаваным голасам адной плакучай валторны.

Прыблізна гэтую ж задачу—дасягнуць непазнавальнасці «голасу» інструментаў—не раз ставіў перад сабой і Барыс Шангін у рабоце над фільмам «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка». Напрыклад, музыка ў сцэне катавання, якое чыняць інквізітары, выконваецца на расцягненых асобым спосабам струнах фартэпіяна. І сапраўды, у нізкіх, глухіх, нібы арганных гуках, якія паступова пераходзяць у тужлівы звон, вельмі цяжка пазнаць які-небудзь сучасны інструмент і ўжо тым больш фартэпіяна. І ў той жа час ні музыка, ні гэтыя гукі не выдзяляюцца самі па сабе з кадра, наадварот, яны ў гэтым месцы гарманічныя з тым, што адбываецца на экране.

Дамагчыся адпаведнасці, поўнай злітнасці гукавога раду і адлюстравання Шангін лічыць адной з найпершых задач гукааператара.

У агучванні фільма гукааператар цяпер, як правіла, карыстаецца сучаснай, складанай апаратурай, пры дапамозе якой можна любы шум, голас, музыку запаволіць, паскорыць, расцягнуць, узмацніць, скарыстаць рэвербірацыю—атрымаць штучнае рэха. Да паслуг гукааператараў на студыях цяпер багатыя шуматэкі, тонатэлье, мантажныя, залы гуказапісаў. Таму, вядома, гукааператар павінен мець шырокія тэхнічныя, нават інжынерныя веды. Такі— Б. Шангін.

...І вось экспедыцыя кінагрупы закончана, гукааператар вяртаецца з запасам фанаграм —запісаў, зробленых на натуры. Пачынаецца мантаж фільма і адначасова ідзе работа над фанаграмай, ідуць канчатковыя запісы шумаў, тэкстаў, музыкі. На гэтым этапе работы запісанае ў экспедыцыях часам зноў перарабляецца. Вопыт работы паказаў гукааператарам і рэжысёрам, што натуральныя гукі ў кіназале часам гучаць менш выразна, чым гукі, створаныя штучна.

Барыс Шангін заўсёды працуе ў цесным, творчым кантакце з кампазітарамі — Алегам Каравайчанкам, Алегам Янчанкам.

Шмат напружання, увагі патрабуе ад гукааператара і запіс тэксту фільма, прачытанага, сыгранага, перажытага эмацыянальна акцёрамі. Таніроўку—запіс акцёраў ужо ў зале, перад экранам праводзяць звычайна разам рэжысёр фільма і гукааператар. І тут перш за ўсё гукааператар сочыць за дынамікай гаворкі, якая павінна адпавядаць дзеянню на экране, за напружаннем, за выразнасцю... Ён адказны за фанаграму!

Нарэшце, яны гатовы — восем шпулек фанаграмы. Гэта—вынік шматмесячнай работы. Але наперадзе яшчэ адзін, апошні этап — перазапіс, і за пультам у зале перазапісу ён, гукааператар Барыс Шангін.

А. ПРАКОПЧЫК.

ГАСТРОЛЬНАЕ ЛЕТА

З АРСЕНАЛА ГАЛОЎНАЙ ЗБРОІ

СПЕКТАКЛЬ «САЛАЎІНАЯ НОЧ» — У СМАЛЕНСКІМ ДРАМАТЫЧНЫМ ТЭАТРЫ

Артыст М. Аляксандраў у ролі генерала Лук'янава.

„САМАЕ важнае цяпер, каб кожны салдат зразумеў, што тут, у Еўропе, ён прадстаўляе сваю вялікую дзяржаву і што галоўнай зброяй яго зараз з'яўляюцца розум і сэрца. Вось так — розум і сэрца».

Гэтыя словы гучаць у п'есе Валянціна Яжова «Салаўіная ноч». Іх гаворыць генерал Лук'янаў — адзін з яе персанажаў, а ў спектаклі, пастаўленым па гэтай п'есе цяперашнім госцем Мінска Смаленскім драматычным тэатрам, — галоўны герой.

Так, так, у гісторыі пра тое, як праз дзень ці два пасля апошніх стрэлаў вайны ў пераможанай Германіі сустрэліся і адкрылі адно аднаму свае сэрцы савецкі сержант Барадзін і юная немка Інга, найбольш хвалюе гледача не само іх раптоўнае каханне (хоць будзе справядлівым адразу адзначыць пераканаўчасць і трапятлівасць дуэту артыстаў В. Амалінай і В. Назарава), а сухаваты немалады генерал, якому хапіла і глыбіні, і сумленнасці, і мужнасці, каб правільна на вестку пра гэта адгукнуцца.

У п'есе, падзеі якой адбываюцца чвэрць стагоддзя назад, пастаноўшчык спектакля М. Херсонскі і выканаўцы ўбачылі магчымасць вострага, актуальнага роздуму пра гуманнасць сацыялістычнай маралі, пра мужнасць стаяць за яе ў складаных, нават рызыкоўных акалічнасцях.

Агульнавядома, што мужнасць праяўляецца не толькі ў адкрытай сутычцы з ворагам, не толькі тады, калі ўсім і табе самому абсалютна ясна, дзе свае, дзе чужыя. Зала выбухае апладысментамі, калі генерал Лук'янаў (у спектаклі гэтую ролю выконваюць два артысты, мне давялося бачыць М. Аляксандрава) вырашае парушыць аддадзены камандуючым пад гарачую руку загад і не перадаваць Барадзіна ў пракуратуру. У напружанай цішыні гучыць адказ генерала на перасцярогу палкоўніка Гуры, што ён, Лук'янаў, прымае ўвесь агонь на сябе і што сержант нават не даведаецца, што «ты зрабіў дзеля яго». У адказе гэтым, вырашаным артыстам як роздум-споведзь,— галоўная думка спектакля:

«Гэта не важна. Зразумей, гэта не толькі для хлопца, гэта і для мяне вельмі важна, што я да канца зрабіў усё, што мог. Разумееш — для мяне! Бо працей за ўсё сказаць: «Гэтаму чалавеку ўсё роўна нельга памагчы» — і прайсці міма. Адзін раз прайсці... другі... і потым нічога не застанецца святога. А без гэтага жыць нельга. Нельга».

Не ведаю, чыя гэта заслуга — тэатра або самога аўтара —але ў варыянце п'есы, які іграецца смалянамі, зроблены абсалютна апраўданыя, разумныя купюры ў параўнанні з апублікаваным часопісным варыянтам. Купюры, якія пазбавілі п'есу ад некаторых саладжавых, не бездакорных з пункту гледжання мастацкага густу, эпізодаў і падкрэслілі, павялічылі маштабнасць галоўнага ў ёй.

У спектаклі нямала акцёрскіх удач. Добрага слова, апроч памянёных ужо В. Назарава, В. Амалінай, М. Аляксандрава, заслугоўваюць А. Юкляеўскі, які з мяккім, добрым пачуццём да свайго героя накідвае штрыхі «першага салдацкага начальства» — старшыны Кузаўкова; В. Паліцаеў у ролі лейтэнанта Федароўскага — за лёгкасцю і хвацкасцю гэтага зухаватага памочніка каменданта ўгадваецца натура не адназначная ў сваёй філасофіі прыстасаванцтва; В. Макараў — выканаўца ролі старшага афіцэра камендатуры Цімафеева, які быў да вайны настаўнікам і застаецца ім і ў маёрскіх пагонах...

У п'есы «Салаўіная ноч» была не самая лёгкая дарога да гледача. Некаторыя тэатральныя дзеячы лічылі нават яе праблематыку хісткай. Спектакль Смаленскага абласнога тэатра яшчэ раз пераконвае, што размова, якая вядзецца ў п'есе В. Яжова, абуджае добрыя, светлыя пачуцці, выклікае ў гледача роздум сур'ёзны, па-харошаму ачышчальны.

Ул. МЕХАЎ.

З ПОШТЫ ЛІМА

ФАКТЫ СУПРАЦЬ АКТАЎ

Калі я пазваніў намесніку начальніка абласнога ўпраўлення культуры М. Лукашуку і спытаў яго, чаму марудзяць з адкрыццём Брэсцкай бібліятэкі імя Горкага, ён адказаў:

— Усё, што залежала ад нас, мы зрабілі. Цяпер затрымка — за будаўнікамі.

— Як?—здзівіўся я.— Хіба яны не здалі будынак?

— Даўно здалі. Ды карысці мала.

— ?!

— Ведаеце, як бывае, калі камісія вельмі жаласлівая? Тады яна падпісвае акт... А пасля за галаву хапаешся. Недаробкі сваімі рукамі не выправіш,—і Міхаіл Васільевіч раіць.—Газета павінна выступіць па гэтым пытанні вельмі востра.

Я адразу ж пайшоў у бібліятэку.

Паказвала мне яе спачатку супрацоўніца метадычнага кабінета Ала Сяргееўна Чавусава. Так, бібліятэка рыхтуецца да адкрыцця... Але... Не хапае стэлажоў, сталоў, крэслаў, падкветачнікаў, стэндаў, бар'ераў і г. д. Іх не паставілі Косаўскі дрэваапрацоўчы камбінат, Баранавіцкая мэблевая фабрыка. Пра ўсё гэта ўжо не раз гаварылі на нарадах у дырэктара. Яно б яшчэ нічога, як кажуць. Але ўся бяда—з-за будаўнікоў.

— Ведаеце, мы пашкадавалі іх, — пацвярджае і дырэктар бібліятэкі В. Васільеў,—бо ім не далі б прэміі. Але яны і так яе не атрымалі!—усміхаецца ён задаволена і пераходзіць на патэтыку:—Дзень адкрыцця бібліятэкі не за гарамі. Наш калектыў робіць усё, каб як мага хутчэй наблізіць гэту ўрачыстую хвіліну.

Я ледзь не апладзірую. Дырэктар здзіўлена глядзіць на мяне.

— А ведаеце, з-за чаго затрымка?—гаворыць Уладзімір Мікалаевіч. — З-за пад'ёмніка.

Я не разумею гэтага магічнага слова і доўга выслухоўваю тлумачэнні. Нарэшце мне ясна, што пад'ёмнік — гэта сэрца бібліятэкі. Але яно не б'ецца—будаўнікі яшчэ не ўстанавілі яго.

Але ці толькі затрымка з-за гэтага? Ва ўсіх вокнах шчыліны, дзверы перакошаны, не па правілах устаноўлены пажарныя скрыні, сцены і столі патрэскаліся... Дырэктар не вельмі наракае на гэта: а раптам тыя два-тры рабочыя, якіх БУ-83 камандзіравала замятаць сляды, знікнуць? Што тады?

За ўсё гэта павінны адказваць не толькі будаўнікі і пастаўшчыкі інвентару і мэблі, не толькі дырэктар бібліятэкі В. Васільеў. Абласное ўпраўленне культуры таксама не ўсё зрабіла, каб адкрыць бібліятэку ў намечаны тэрмін. Грошы на мэблю, вядома, адпусціла, акт аб прыёме будынка заўчасна падпісала, час ад часу нават званіла, цікавілася — як там у вас... Але кантролю за будаўніцтвам бібліятэкі не наладзіла.

«Калі ж урэшце будзе адчынена бібліятэка?» — пытаюцца чытачы. Ніхто ў Брэсце гэтага не ведае.

А. ГАРАЙ,
літсупрацоўнік Брэсцкай абласной газеты «Зара».

КНІГА ПАКЛІКАЛА Ў ПАХОД

У Крупскім раёне ў час Вялікай Айчыннай вайны мужна змагалася дэсантная група дзяўчат-падрыўніц на чале з Аленай Колесавай. Пры разгроме ваеннага гарнізона ў вёсцы Выдрыца адважная патрыётка загінула. Пасмяротна ёй прысвоена ганаровае званне Героя Савецкага Саюза.

У Крупках ля школы № 2, якая носіць імя гераіні, узвышаецца помнік Алене Колесавай. Яе нароткае, але гераічнае жыццё зацікавіла следапытаў Абчугскай сярэдняй школы. Вучні 5—8 класаў прачыталі кнігу Рыгора Няхая «Алёшка-атаман», якая расказвае пра жыццё мужнай партызанкі і вырашылі правесці паход па мясцінах, дзе ваявала Алена Колесава.

І. РАБКОЎ.

ЭКРАН ДЫЯФІЛЬМА ПАШЫРАЕЦЦА

На мінскім механічным заводзе імя С. І. Вавілава сканструявалі першы ў краіне праектар для дэманстрацыі звычайных дыяфільмаў на шматметровым экране ў вялікіх лекцыйных залах. Апарат мае спецыяльную прыстаўку, якая дазваляе адразу праектаваць на экран без дадатковай зарадкі да дваццаці кадраў. Дыяпазітывы ўстанаўліваюцца ў металічныя гнёзды, якія захоўваюць іх ад механічных пашкоджванняў, а таксама аблягчаюць лектару іх тэматычны падбор.

Перавагай «Гарызонта» з'яўляецца і тое, што з яго дапамогай можна паказваць на вялікім экране кадры са звычайнай кіна- і фотаплёнкі памерам 24×36 міліметраў.

Новы кадрапраектар знойдзе шырокае прымяненне ў культасветустановах, пры правядзенні лекцый і тэматычных вечароў, а таксама ў школах, тэхнікумах, інстытутах на занятках па эстэтыцы, мастацтву.

ТЫСЯЧА СПЕКТАКЛЯЎ НАРОДНАГА ТЭАТРА

Грамадскасць Бабруйска адзначыла 20-годдзе творчай дзейнасці народнага тэатра мясцовай прамысловасці. Тэатр — жаданы госць на прамысловых прадпрыемствах горада, у калгасах і саўгасах раёна. Неаднаразова гэтаму калектыву прыходзілася выступаць на абласных і рэспубліканскіх аглядах самадзейнасці, выязджаць са спектаклямі за межы рэспублікі. А рэпертуар тэатра не малы. Тут творы Янкі Купалы, Кандрата Крапівы, Канстанціна Сіманава, Аляксандра Карнейчука, Аляксея Арбузава і многіх іншых рускіх, беларускіх, украінскіх пісьменнікаў.

За дваццаць гадоў сцэнічнай дзейнасці артысты тэатра паставілі на самадзейнай сцэне больш тысячы спектакляў, на якіх пабывала амаль паўмільёна гледачоў.

Калектыў тэатра па праву ганарыцца сваімі выхаванцамі — швачкай атэлье Н. Шыдлоўскай, бібліятэкарам Л. Дунаевай, слесарам В. Дземідзенка, мадэльшчыкам Б. Марынічавым, медыцынскай сястрой Е. Голікавай і многімі іншымі самадзейнымі народнымі артыстамі.

СТАРОНКІ АДНОЙ МУЗЫЧНАЙ ХРОНІКІ

Выступае хор музычнай школы.

З МАГІЛЁЎСКАЙ музычнай школай мы аднагодкі. Нам споўнілася чатыры, калі школа выпусціла сваіх першых дзевяць вучняў. Мы ледзь зразумелі азы музычнай пісьменнасці, а нашы старэйшыя таварышы—цяпер заслужаная артыстка РСФСР Таццяна Талахадзе і прафесар Маскоўскай кансерваторыі доктар мастацтвазнаўства Леў Гінзбург ужо былі на шляху да вялікага музычнага жыцця. Многія з «нашых», хто нарадзіўся разам са школай, былі тады на цвёрдай прафесіянальнай дарозе.

Магілёўская музычная школа ў год свайго нараджэння называлася «Першай рабочай музычнай студыяй», яна была заснавана на базе духавога аркестра пры гарадскім савеце прафсаюзаў. Духавы аркестр праводзіў маршавыя роты на франты грамадзянскай вайны, абслугоўваў першыя выбары ў мясцовыя Саветы, выязджаў у вёскі. Пазней школе было прысвоена імя вялікага рускага кампазітара М. А. Рымскага-Корсакава. Першымі вучнямі школы былі аркестранты. выхаванцы дзіцячага дома.

Ужо ў 1924 годзе аркестр музычнай школы пад кіраўніцтвам Я. Пеўзнера ўдзельнічаў у пастаноўцы першай беларускай оперы М. Чуркіна «Вызваленая праца», прэм'ера якой адбылася ў Магілёве.

З моманту заснавання школы адбылося 43 выпускі. Сярод выпускнікоў — равеснікі школы заслужаны артыст РСФСР Барыс Афанасьеў, дацэнт Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, загадчык кафедры струнных інструментаў Мікалай Браценнікаў, заслужаная настаўніца БССР Л. Ліхачова, вядучы педагог Магілёўскага музычнага вучылішча Ніна Мендзялеўская і многія іншыя. Выхаванцаў школы можна сустрэць далёка за межамі Беларусі.

Зараз школу заканчваюць больш 100 выпускнікоў у год, палавіна якіх паступае ў музычнае вучылішча і іншыя культурна-асветныя навучальныя ўстановы рэспублікі. Сёлета сярод магіляўчан, якія вучацца ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі,— Наталля Жыжэнка, лаўрэат усебеларускага конкурсу маладых выканаўцаў і Галіна Кандрацюк, лаўрэат конкурсу пяці рэспублік у Кішынёве.

Традыцыяй, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне, сталі ў школе заняткі ў аркестравым класе. Цяпер тут працуюць некалькі аркестравых калектываў: папулярныя ў горадзе ансамбль скрыпачоў, сімфанічны і цымбальны.

У музычнай біяграфіі навучальнай установы ёсць яркія старонкі. На фестывалі дзіцячага самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады, аркестр баяністаў і сімфанічны аркестр атрымалі дыпломы І ступені. Малады калектыў юных віяланчэлістаў атрымаў званне лаўрэата Усесаюзнага фестывалю, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады, і ў лістападзе 1967 года выступаў у заключным канцэрце ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў. У маі мінулага года ансамбль прымаў удзел у заключным канцэрце Усесаюзнага фестывалю майстроў опернага і балетнага мастацтва ў Мінску.

Дзесяць гадоў назад калектыў школы упершыню выступаў па тэлебачанні і цяпер штогод выступае з канцэртамі перад аматарамі блакітнага экрана.

Розныя нашы біяграфіі, і не ўсе мы сталі прафесіянальнымі музыкантамі, але любоў да мастацтва, выхаваную ў школе, нясём праз жыццё.

Я. МЯЦЕЛІЦА,
былы выхаванец Магілёўскай музычнай школы.

Самыя маладыя выканаўцы школьнага ансамбля скрыпачоў Міша Хачар і Валодзя Голубеў.

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

СЯРОД КНІГ

Ніл ГІЛЕВІЧ

ТАЛЕНТ, УДЗЯЧНЫ БАЦЬКАЎШЧЫНЕ

НАША беларуская паэзія мне ўяўляецца нашым жа беларускім лесам, дзе вельмі хораша і зусім натуральна суседнічаюць усе пароды дрэў, што растуць адвеку на гэтай зямлі, на берагах Дняпра і Сожа, Нёмана і Буга, Дзвіны і Віліі, Прыпяці і Пцічы, Бярэзіны і Гайны, Свіслачы і Шчары... Дзесяткі розных парод дрэў, і ў кожнага — свая прыгажосць, свая трываласць і даўгавечнасць, свае цвет і водар, свая пара квіцення і ўвядання.

Высачэзныя магутныя дубы кідаюцца ў вочы здалёк — яны ўзвышаюцца над усімі, і безумоўна, маюць права на асаблівую ўвагу, бо складаюць найбольшую славу зямлі, якая іх узгадавала. Але яны зусім не прыніжаюць высакароднай годнасці выносістых карабельных сосен, кашлатых вастраверхіх ялін, кучаравых клёнаў і цяністых ліп, мускулістых вязаў і светлалістых ясеняў. Добра чуюцца ў гэтай грамадзе і беларокія бярозы, і трапяткія асіны, і лагодныя таполі, і сціплыя вольхі. Не ў крыўдзе на лёс — хапае святла і прастору! — і русакосыя вербы, і сарамяжлівыя рабіны, і шурпаты арэшнік, і калючы ядловец... А ў цэлым — якая незвычайная гармонія фарбаў і тонаў, якая дзівосная сомфонія шумаў і пошумаў, шорахаў і шалясцення!..

Чымсьці накшталт гэтага лесу бачыцца мне і наша паэзія— шматлікая грамада «харошых і розных» талентаў, у кожнага з якіх — свая краса і сіла, свая трываласць і даўгавечнасць, свой цвет і водар. І ніякі сапраўдны талент не можа быць заменены іншым — няхай сабе і больш буйным і значным—гэтак жа, як нізкарослы арэхавы куст не можа быць заменены веліканам дубам, ужо хаця б таму, што на дубе не растуць арэхі.

Мне заўсёды думалася, што адзін з важнейшых абавязкаў крытыкі — убачыць вось гэтае «сваё», «адметнае» ў творчым абліччы паэта, раскрыць і паказаць яго іншым, гэта значыць, чытачам, бо — вяртаюся да ўзятай вобразнай паралелі — «паэтычны лес» вялікі, іншы можа і не заўважыць, што, апрача «дубоў ды сосен», ёсць і яшчэ шмат вельмі прыгожых хвойных і зялёналістых «дрэў».

Няхай мне даруецца гэта занадта вялікая прэамбула да невялікай і канкрэтнай гаворкі пра зборнік выбраных вершаў аднаго з нашых старэйшых паэтаў. Можа, якраз таму і захацелася мне напачатку выказаць свой агульны позірк на нашу паэтычную гаспадарку, што гаворка пойдзе пра творчасць, а больш дакладна — пра лірыку паэта, якога крытыка асабліва не песціла ўвагай, а ў так званыя паэтычныя абоймы яго імя, здаецца, і зусім ніколі не трапляла. А між тым лірыка Васіля Віткі — а мы будзем гаварыць пра яго — з'ява далёка не радавая ў нашай літаратуры. Выдадзены ў серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі» томік выбраных вершаў паэта дае магчымасць пераканацца, што перад намі талент моцны і самабытны і што мы маем справу з майстрам слова самай высокай кваліфікацыі, майстрам наколькі вопытным, настолькі і патрабавальным.

В. Вітка належыць да ліку тых паэтаў, якія не гоняцца за колькасцю, не спяшаюцца выдаваць на-гара прадукцыю ва ўдарным парадку. Думаю, што гэта можна растлумачыць толькі самой прыродай таленту паэта і характарам адносін да творчасці. Апрача таго, трэба напомніць, што пяру Віткі належаць і празаічныя творы, і драматургічныя, а галоўнае — што ён з'яўляецца буйнейшым нашым дзіцячым паэтам.

В. Вітка не прыспешвае сваю лірычную музу, бо ведае, што ёй не ўласціва адзывацца на самы першы дотык рэчаіснасці, выдаваць самае першае ўражанне, нявынашанае і нявыверанае часам, за тую адзіную праўду, якую павінен і мае права гаварыць паэт. Таму пачуццё выпадковае і павярхоўнае не ўвядзе яго ў зман і не стане эмацыянальнай асновай твора. У верш кладзецца толькі пэўнае, несумненнае, тое, што ўсталявалася, што глыбока запала ў сэрца і прарасло думкай, выспела значнай ідэяй. Само сабой зразумела, што пры такім характары творчасці нельга чакаць лірычнага кіпення, бурных усплёскаў эмоцый, рэзкіх, разухабістых, непрыцэленых паваротаў думкі. Стрыманасць і ўраўнаважанасць, роздум і засяроджанасць, як правіла, пануюць у лірычных вершах паэта. Я сказаў: стрыманасць і ўраўнаважанасць, але ні ў якім разе не душэўная заспакоенасць і абыякавасць. Адна з асаблівасцей таленту паэта якраз у тым і заключаецца, што ён вельмі не абыякавы да свету рэчаіснасці, да самых разнастайных праяў жыцця, што ён паэт глыбокага сацыяльнага пачуцця і значнай грамадзянскай актыўнасці.

У нас звычайна да грамадзянскай лірыкі залічаюць перш за ўсё вершы з відавочнымі, а таму нярэдка павярхоўнымі адзнакамі гэтай грамадзянскасці — скажам, творы выразна публіцыстычныя, надзённыя па тэматыцы, напісаныя па слядах нейкіх важных палітычных або грамадскіх падзей і г. д. Думаецца, аднак, што сапраўдны грамадскі змест і значэнне паэтычнага твора не змяншаецца ад таго, што ў яго аснову лягло не апошняе паведамленне друку, а тэма з катэгорыі ўстойлівых, больш або менш пастаянных і нават вечных. Наша сацыялістычнае грамадства, напрыклад, не адмаўляецца і ніколі не адмовіцца ад такіх духоўных і маральных набыткаў ранейшых пакаленняў, як любоў чалавека да працы, да зямлі, дзе ён нарадзіўся, да родных і блізкіх, як вернасць у дружбе і каханні, гатоўнасць дапамагчы чалавеку ў бядзе і многае іншае. Няма ніякага сумнення, што ўсе гэтыя якасці будуць уласцівы і патрэбны людзям камуністычнага грамадства не менш, чым сёння нам. А гэта значыць, што творы, якія здольны выхоўваць такія якасці ў нашага маладога сучасніка, належаць да ліку грамадска значных і актуальных.

Калі з гэтага пункту гледжання зірнуць на паэзію В. Віткі, то лёгка заўважыць, што ён як бы пазбягае тэм-аднадзёнак, тэм-скараспелак і аддае перавагу тэмам, якія заключаюць у сабе нейкую пастаянную велічыню, якія не трацяць сваёй вагі і значэння пры любых пераменах грамадскага клімату. Можа быць пагэтаму тэматыка яго паэзіі не здаецца шырокай. Паэт не раскідваецца, не хапаецца за ўсё, што можа стаць вершам, не спакушаецца «матэрыялам» эфектным і ў пэўным разуменні выйгрышным. Як правіла, ён піша пра вельмі істотнае, засяроджвае ўвагу на прадметах найбольш дарагіх, значных, важкіх. У многіх выпадках самі назвы вершаў красамоўна пацвярджаюць гэта. Паглядзіце ў змест зборніка: «Гартаванне», «Бяссмерце», «Горкі вырай», «Бацька», «Дома», «Маці», «Дзед», яшчэ раз «Бацька», «Спадчына», «Хлеб», «Свабода». Зрэшты, назвай можа быць і такая, «здавалася б, рэч непрыкметная», як «старая бацькоўская лыжка», — важна, што і ў такіх выпадках усё роўна гаворка вядзецца не пра дробязь, як можа здацца на першы погляд, а пра маральныя і духоўныя вартасці агульначалавечага значэння.

Першая і нязменная, усеабдымная і скразная тэма паэзіі В. Віткі — гэта тэма Бацькаўшчыны, тэма Радзімы. Бадай што ніхто з літаратурных равеснікаў паэта так не прывязаны сваёй творчасцю да роднай бацькоўскай зямлі, як ён. Які б з лірычных вершаў мы ні ўзялі, мы ўбачым, што калі не цалкам, то прынамсі нейкай часткай свайго зместу гэта ўсё-такі твор аб Радзіме, што так ці інакш думка паэта вяртаецца на родную зямлю, перакідваецца туды, дзе ён нарадзіўся, рос і вучыўся пазнаваць людзей, жыццё і свет, дзе зведаў шчасце і гора і дзе зразумеў, што найпершы, свяшчэнны і пажыццёвы абавязак паэта — адказваць «за чалавечы лёс, за будучае шчасце на планеце».

Не многа ў каго з нашых паэтаў можна знайсці такую паслядоўнасць у выяўленні пачуцця найглыбейшай пашаны да роднай бацькоўскай зямлі, як гэта мы бачым у лірыцы В. Віткі. І не толькі пашаны, але і сардэчнай сыноўняй удзячнасці Радзіме за ўсё, што яна яму дала, удзячнасці бацькам, дзядам і прадзедам за іх вялікую спадчыну, за іх навуку і запавет. З верша ў верш неадступна праводзіць ён думку, што чалавек толькі тады Чалавек, калі ў яго душы ёсць святое пачуццё любві да Бацькаўшчыны, калі ён не страціў усведамлення свайго вечнага абавязку перад ёю, калі ён помніць, што заўсёды і скрозь павінен даражыць яе імем, калі для яго з'яўляюцца свяшчэннымі такія паняцці, як родны кут і бацькоўская хата, як праца і сумленна заправаны хлеб, як павага да людзей і ад людзей. У гэтым сэнсе паэзія В. Віткі высокамаральная ў сапраўдным значэнні слова, маральная па самой сваёй прыродзе, бо ў яе здаровая народная аснова, бо яе глеба — жыццё працоўнага чалавека, узятае ў лепшых, вышэйшых праяўленнях яго творчага духу.

Мы ўжо ўспаміналі мімаходзь пра верш «Бацькава лыжка». Сапраўды, рэч, здавалася б, зусім непрыкметная — звычайная драўляная лыжка, кавалачак грушы-дзічкі, няхай сабе і з «даўнімі ўзорамі» на цаўі. Чаму ж, аднак, ёй такая пашана ў бацькоўскай хаце:

І хай сабе час на саломінку
Усю яе высушыў,
выпетрыў,
У хаце старой, на
прыкомінку,
Вышэй яна царскага
скіпетра.

Таму і пашана, што гэта не проста лыжка, а **бацькава** лыжка, якая служыла яму доўгія гады аж да апошніх дзён, і вось — «нябожчыкам большаму сыну яна перададзена ў спадчыну». Гэта спадчына не багацце, а спадчына-запавет, бацькоўскі наказ сыну — жыць гэтак жа строга па законах чалавечага сумлення, як жыў ён.

Такім жа глыбокім пачуццём павагі да чалавека працы прасякнуты і выдатны верш «Дзед» — горкі ўспамін пра развітанне з галоўным і самым паважаным членам вясковай сялянскай сям'і. Уваскрашоны ў памяці малюнак, што адбіўся некалі ў дзіцячых вачах і сэрцы, пададзены ў вершы ў суровай рэалістычнай манеры, з пільнай увагай да ўсіх бытавых рэалій. Вось дзеда пакалі на лаве,

І нібы на якое свята
Ці на кірмаш ён ехаць
меў—
Уся яго збірала хата.
А ён збірацца не хацеў.

Як бы на ўсё махнуў рукою
І, падтуліўшы бараду,
Прасіў: пакіньце у спакоі,
Я з гэтай лавы не сыду.

А ўжо ваду нагрэлі ў печы,
Пад пахі дзеда ўзялі,
Над цэбрам шаравалі
плечы
І доўга цёрлі мазалі

Каструбаватых тых
далоняў,
Што перагладзілі наўкруг
Чужыя выцерабы, блоні,
І дворны цэп, і цяжкі плуг.

Што асабліва дорага лірычнаму герою паэта ў духоўным абліччы продкаў? Дорага перш за ўсё іх чалавечая годнасць, з якою яны прайшлі праз нялёгкае і нават трагічнае жыццё, дорага тое, што яны былі сапраўднымі людзьмі. Вельмі паказальны ў гэтых адносінах верш «Бацька» — паэтычная біяграфія пакалення тых, што праз «парабкоўства па дварах», праз голад і галечу прыйшлі да светлай долі, а калі прабіў час — мужна склалі галовы, але не адступіліся ад сваіх заваёў.

— Маўчыш? Ну што ж,
маўчы, маўчы...—
І зноў дзвярыма пальцы
ломяць,
Каб скатаванага павалачы
І кінуць на турэмную
салому.

Счакаўшы — нанава,
і так штодня,
Але ўжо і самім
не застаецца часу:
— Яшчэ не перадумаў,
старшыня,
Яшчэ не выракся свайго
калгасу?

Так закончылася жыццё простага чалавека — былога парабка і шаўца, руплівага хлебароба, які ніколі не лічыў сябе героем. Але хіба яго жыццё не варта славы, не варта памяці і падражання? Яшчэ як варта! І таму прызнанне паэта: «У непадкупны і суровы век і я пражыць сваё жыццё так згодны» вельмі лагічна падагульняе гэты праўдзівы і змястоўны твор.

Дорага памяць продкаў — дорага і тое, што моцна шанавалі пры жыцці дзяды і прадзеды. Напрыклад, хлеб. Сумленна зароблены хлеб. У нашай паэзіі ёсць многа вершаў і нават паэм пра хлеб — ужо можна было б скласці (а, можа, і варта скласці?) цэлую паэтычную анталогію ў гонар яго вялікасці Хлеба. Думаю, што адным з прыгажэйшых перлаў у такой анталогіі быў бы напісаны ў 1958 годзе верш В. Віткі «Хлеб», змест і паэтыка якога, дарэчы, дазваляюць аднесці яго, на мой погляд, да жанру балады. Вы ж не забыліся, паважаны чытач, як пачынаецца ў вясковай хаце хлеб, уяўляеце «дзень яго слаўных народзін»?

Калі кажухамі старымі
накрыты,
Спачатку лагодны і млявы,
Ён рапгам стагнаць
пачынае сярдзіта,
Нібыта мядзведзь у аблаве,

Тады раскрываюць яго
асцярожна,
І рукі закасвае маці,
І вось у вясёлае падарожжа
Едзе наш хлеб на лапаце.

Спадыспаду высланы
лістам дубовым,
Духмяным пасыпаны
кменам,
Вяртаўся ён з печы,
як сонца, ружовы
І доўга свяціў на стале
нам.

Гэтак жа, як і хлеб надзённы, дорага паэту і хараство роднага краю, якое таксама ёсць спадчына продкаў. Ад іх — ад бацькоў і дзядоў — навучыўся ён разумець прыгажосць зямлі, па якой яны хадзілі, ад іх перадалося яму і ўсведамленне сябе як гаспадара, заступніка і абаронцы гэтай прыгажосці. Вось чаму з такім пранікненнем і замілаваннем падае ён мілыя сэрцу вобразы і малюнкі бацькаўшчыны. Давайце ж крыху пройдземся з паэтам па прасторах Случчыны, палюбуемся разам яе краявідамі, падыхаем духмяным водарам яе лугоў, лясоў і пералескаў.

Зязюльчын мох,
гладышыкі, чабрэц, —
Зноў пазнаю вас у траве
высокай.
Са смагі поўны п'ю карэц
Халоднага бярозавага соку.

І хітраю сцяжынкаю лясной
Іду у салаўіныя харомы,
З чырвонастволай, гонкаю
сасной
Вітаюся, як даўнішні
знаёмы.

Гэта — яшчэ з даваеннага верша «На выгодзе». Роўна праз дваццаць гадоў чароўная беларуская мелодыя як быццам перанесла паэта ў родны бор — і з-пад яго пяра паявіліся цудоўныя «Верасы» — верш-песня, верш-музыка, пачуўшы якую, і нам хочацца пабегчы басаноож туды,

Дзе прабіваюць тоўсты
мох
Грыбы баравікі,

Дзе сонца пырскае з суніц
І сонныя чмялі
За дзень ад паху медуніц
Зусім абнемаглі,

Дзе ў пацерках густой
расы,
Між цёплых баравін,
Нам песню дораць верасы
На дарагі ўспамін.

Закаханы ў шчодрае хараство роднай зямлі, паэт натуральна не можа прайсці раўнадушна міма бяздумнага вынішчэння прыродных багаццяў Радзімы. З болем, з горкай іроніяй гаворыць ён у вершы «Помнік ласю» пра сустрэчу з гэтым адвечным жыхаром беларускіх лясоў і пушчаў, але не з жывым — жывога ляся ўжо спаткаеш не часта, — а з тым, што няйначай для памяці «ў бронзе на заказ адліт». І зноў жа тут нам вельмі імпануе маральная вышыня аўтарскай пазіцыі, — вышыня і, я сказаў бы, — глыбіннасць, гэтая ўнутраная правата, якая ніколі і нікім не можа быць узята пад сумненне. Пры гэтым трэба агаварыцца, што паэзіі В. Віткі зусім не ўласціва маралізатарства — прытчавых і павучальных інтанацый у яго вершах няма. Ён гаворыць пра жыццё і людзей мовай паэзіі, але гаворыць з тым высокім усведамленнем чалавечай годнасці, якое выяўляе сапраўдную культуру пачуццяў і якое міжволі перадаецца чытачу, уздымаючы і яго на новы, духоўны рубеж.

Характарыстыка патрыятычных матываў у лірыцы В. Віткі будзе недаравальна няпоўнай, калі мы не ўспомнім некаторыя яго вершы ваеннай пары, такія, напрыклад, як «Горкі вырай», «Поўдзень», «Пераправа». Ніколі, відаць, пачуццё Бацькаўшчыны ў душы паэта не было такім абвостраным, як у грозны час вайны, калі было адабрана найбольшае шчасце — «жыць пад родным небам». І ніколі, відаць, не было такога яснага ўсведамлення сваёй адказнасці і грамадзянскага абавязку перад Радзімай. Цяжка ўстрымацца, каб не прывесці хаця б некалькі радкоў з верша «Горкі вырай» — верша надзвычайнай эмацыянальнай і паэтычнай сілы, які несумненна належыць да самага лепшага, што ёсць у беларускай (ды не толькі ў беларускай!) паэзіі аб Вялікай Айчыннай вайне:

Родны край! Веру
ў суджаны час,
Для мяне ты адзіная ўцеха,
Толькі цяжкая ноч
паміж нас,
І экспрэсам яе не праехаць.

Хто вылічвае дні,
хто прывык
Пачакаць і адкласці
да лета,
Каб на першы ўрачысты
цягнік
Запасціся плацкартным
білетам,

Прагну шчасця па праву
дажыць,
Каб у вочы глядзець
яму шчыра.
Не дажыць—
Лепей голаў дачасна
злажыць,
Чым вярнуцца дамоў
пасажырам!

Як было ўжо зазначана ў пачатку, В. Вітка — паэт акрэсленага сацыяльнага пачуцця, якое нідзе не дае яму забыць, што ён паходзіць з «дынастыі Нямых, Глухіх, Галодных», што ён нашчадак «Голых, Босых, Бітых» (верш «Тытулы») і што яму высокі тытул чалавека і грамадзяніна дала перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі, Савецкая дзяржава. З гэтым гордым усведамленнем паэт выходзіў з дымнай кузні дзядзькі Нікадыма на шырокія шляхі жыцця, з ім ён уступіў у рады абаронцаў Радзімы ад лютага ворага чалавецтва — фашызму, з ім ганарыўся і ганарыцца індустрыяльнай магутнасцю сваёй Рэспублікі (верш «Зубр і Форд»), грандыёзнымі дасягненнямі айчыннай навукі і тэхнікі («Крыллі»), з ім хадзіў паэт па вуліцах і плошчах славутай французскай сталіцы («Парыж», «Свабода», «Кірмаш вясёлых жабракоў»). Думаецца, што ў гэтым сэнсе паэзія Віткі магла б служыць добрым прыкладам для некаторых нашых маладых аўтараў, у творчасці якіх — не будзем грахоў утойваць — часам сацыяльная пазіцыя або неакрэслена зусім або выяўлена так невыразна, што і разгледзець цяжка.

У пасляваенныя гады — а чым бліжэй да нашых дзён, тым больш—у паэзіі В. Віткі развіваецца адна вельмі каштоўная якасць, на якую сумысля хочацца звярнуць увагу чытачоў. Я маю на ўвазе гумарыстычны і сатырычны ўхіл, які асабліва адчувальна дае аб сабе знаць у апошняй трэці зборніка (а зборнік складзены ў храналагічным парадку). Гумар паэта ў большасці выпадкаў носіць выразную адзнаку фальклорнага паходжання. Часцей за ўсё гэта гумар чалавека добрай душы ці, як кажуць, гумар сяброўскі, які не крыўдзіць, а стварае вясёлы настрой. Такой гумарыстычнай афарбоўкай вызначаюцца вершы «Барада», «Восень у Каралішчавічах», «Тытулы», «Дарагія стрэлкі».

Сродкамі сатырычнага адлюстравання — іроніяй і нават сарказмам — паэт карыстаецца там, дзе гаворка ідзе пра з'явы сацыяльна варожыя, небяспечныя і шкодныя. Так, элементы сацыяльна-палітычнай сатыры бачым мы ў вершах «Свабода», «Дэсантнікі», «Зубр і Форд», «Кірмаш вясёлых жабракоў». У апошнім з іх, напрыклад, паэт вельмі дасціпна і з'едліва, з зайздросным бляскам майстэрства іранізуе над вулічнай творчасцю «свабодных» мастакоў Парыжа — «непрызнаных, неадкрытых, ашуканых і забытых»:

— Эй, месье, вы б не
збяднелі,
Франк мне кінуўшы
ў берэт.
Я адразу на панелі
Намалюю ваш партрэт.

Чах-жых,
Яшчэ штрых,
Яшчэ хвіля,
Яшчэ міг:
На асфальце—
Крэйды след.
Забірайце
Свой партрэт...

Але рынуўся натоўп—
Растаптаў,
Расцёр,
Растоўк
І партрэты, і карціны,
І жабрацкія санцімы,
Што звінелі
На панелі...

Добры пук вострых іранічных стрэл, скіраваных супраць розных сацыяльна шкодных з'яў жыцця нашага грамадства, выпушчаны паэтам з арыгінальнай нізкай «Эпітафія вірусам». Гэта сатыра моцная, ваяўнічая і бескампрамісная. Вось пачатак раздзела «Асцярожна»:

Памёр Вірус,
Закапалі ў магілу,
А ён вылез,
Збудаваў вілу

На сто тысяч з ганкам,
З гаражом, агарожай,
«У двары злы сабака.
Асцярожна!»

У гэтай рэчы зноў жа міжволі звяртаеш увагу, да чаго хораша служыць паэту фальклор, мудрае і трапнае народнае слоўца! Асобныя часткі «Эпітафіі...» (напрыклад, «Прамова на хаўтурах») уяўляюць сабой надзвычай удалае перайманне форм і паэтыкі некаторых традыцыйных фальклорных жанраў. Па сваёй дасціпнасці, трапнасці і афарыстычнасці яны могуць стаць побач з лепшымі народнымі сатырычнымі песенькамі, жартамі і каламбурамі...

Ну, а дзе ж недахопы, недагляды, памылкі, пралікі? — спытаеце вы, паважаны чытач. — Няўжо за сорак гадоў паэтычнай работы іх так і не было ў Віткі?

Думаю, што былі —і пралікі, і недагляды. І нават доўгія застоі, калі ён амаль зусім не пісаў вершаў, як, напрыклад, з 1947 па 1954 год. Была калісьці пара вучнёўства. Потым быў творчы разбег. Даўным даўно ўжо, як прыйшла да паэта сталасць. А сталасць выдаткаў творчасці звычайна сабе не дазваляе. Безумоўна, і ў гэтым зборніку — калі параўнаць яго з садовым дрэвам — не ўсе плады аднолькавай велічыні і вартасці. Але пустацвету ў ім я не знайшоў. Паточанай завязі не знайшоў таксама.

Васіль Вітка. Лірыка. «Бібліятэка беларускай паэзіі». Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1968.

Вокладкі новых кніг, якія выйшлі ў выдавецтве «Беларусь»: «Віцебскае падполле» Н. Пахомава, М. Дарафеенка, Н. Дарафеенка (мастак В. Юрчанка), «Літаратура і мова. Кніга пра майстэрства» Р. Шкрабы (мастак В. Жыжэнка), «Марка» І. Сіняўскага (мастак Ю. Пучынскі), «Халасцяк» Б. Сачанкі (мастак А. Чуркін), «Пялёсткавы бераг» І. Кірэйчыка (мастак І. Капелян), «Усмешкі» А. Вішні (мастак В. Ціхановіч).

ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

ВУЧОНЫ І ПЕДАГОГ

Паўлу АХРЫМЕНКУ — 50 гадоў



16 ліпеня споўнілася пяцьдзесят гадоў літаратуразнаўцу Паўлу Ахрыменку. З гэтай нагоды праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала юбіляру прывітанне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Павел Паўлавіч!

Шчыра віншуем Вас, вучонага, педагога, крытыка і літаратуразнаўцу, у дзень Вашага пяцідзесяцігадовага юбілею.

Вы шмат зрабілі ў даследаванні брацкіх сувязей між украінскай і беларускай літаратурамі, у даследаванні беларускай народнай творчасці, нацыянальна-фальклорных вытокаў нашай літаратуры. Вашы кнігі з'яўляюцца каштоўным дапаможнікам настаўніцтву, шырокаму чытачу, значным укладам у наша літаратуразнаўства.

Вы таксама палымяны прапагандыст твораў беларускай літаратуры на Украіне.

Жадаем Вам, дарагі Павел Паўлавіч, моцнага здароўя і нястомнай творчай энергіі. Чакаем Вашых новых кніг, даследаванняў, артыкулаў».

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» таксама далучаецца да гэтых віншаванняў і пажаданняў.

■

ДА СВАЙГО пяцідзесяцігоддзя доктар філалагічных навук, прафесар і загадчык кафедры літаратуры Гомельскага універсітэта Павел Паўлавіч Ахрыменка прыйшоў са значнымі творчымі здабыткамі. Ён не толькі паспяхова займаецца выкладчыцкай дзейнасцю, але і з'яўляецца адным з найбольш актыўных працаўнікоў нашай літаратуразнаўчай навукі.

Нарадзіўся П. Ахрыменка на Палтаўшчыне ў сялянскай сям'і. У 1937 годзе паступіў на філалагічны факультэт Кіеўскага універсітэта, які скончыў восенню 1944 года.

Паваротным для асабістага лёсу П. Ахрыменкі стаў 1950 год. Тады ён у Адэскім універсітэце абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную праблемам крытычнага рэалізму ва ўкраінскай літаратуры.

Працуючы выкладчыкам Гомельскага педінстытута, Павел Паўлавіч па-сапраўднаму зацікавіўся гісторыяй Беларусі, яе мовай, заняўся глыбокім вывучэннем багаццяў беларускага фальклору і літаратуры. Асаблівую ўвагу праявіў даследчык да беларуска-ўкраінскіх сувязей у галіне літаратуры і культуры наогул. Ён сабраў надзвычай багаты і цікавы матэрыял, які дазволіў вучонаму дэталёва прасачыць усю гісторыю культурна-літаратурных сувязей двух братніх народаў, пачынаючы ад глыбокай старажытнасці і канчаючы нашым часам. Пры гэтым трэба адзначыць, што П. Ахрыменка не абмяжоўваўся толькі тымі матэрыяламі, якія былі раскіданы па розных, часта маладаступных і таму звычайна невядомых для шырокага кола выданнях. Ён звяртаўся да дзяржаўных і прыватных архіваў, рабіў фальклорныя запісы, шырока выкарыстоўваў успаміны вядомых дзеячоў беларускай і ўкраінскай культуры, якія ў свой час мелі пэўныя адносіны да наладжвання сувязей паміж украінцамі і беларусамі.

У 1958 годзе П. Ахрыменка ў БДУ імя Леніна абараніў доктарскую дысертацыю «Украінска-беларускія літаратурныя сувязі», а праз год атрымаў званне прафесара рускай літаратуры і літаратуры народаў СССР.

Нямала папрацаваў П. Ахрыменка і над вывучэннем непасрэдна беларускай літаратуры. Яму належыць — кніга «Беларуская літаратура другой паловы XVII—XVIII стагоддзяў» (Гомель, 1957, на рускай мове), раздзел па гэтай жа тэме ў першым томе акадэмічнай «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры», а таксама напісаны ў сааўтарстве з прафесарам М. Ларчанкам вучэбны дапаможнік для філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі «Старажытная беларуская літаратура», выдадзены ў 1968 годзе.

З прац П. Ахрыменкі, прысвечаных вывучэнню нашай фальклорнай спадчыны, прыгадаю брашуру «Беларускія загадкі, прыказкі, прымаўкі» (1961), кнігі «Беларускія песні і казкі» (1965), «Беларуская літаратура і фальклор» (1962), вучэбны дапаможнік «Беларуская вуснапаэтычная творчасць» (апошняя праца напісана калектывам аўтараў).

Займаўся П. Ахрыменка і запісамі фальклорных тэкстаў, а таксама складаннем зборнікаў фальклорных матэрыялаў.

Новых поспехаў вам, новых здзяйсненняў, Павел Паўлавіч!

Дз. БУГАЁЎ.

РАБОТА ПА ДУШЫ

ЯШЧЭ мо і года не прайшло, як у Юзэфоўскім сельскім клубе адкрылася бібліятэка. Загадвае ёю Аляксандра Рыгораўна Райдудзіна — вопытны, ініцыятыўны спецыяліст. Летась яна завочна закончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум.

Райдудзіна ўмее прапагандаваць літаратуру. У бібліятэцы аформлены кніжныя выстаўкі, развешаны плакаты.

Цікава прайшоў музычна-літаратурны вечар «Ленін у нашым жыцці», які Райдудзіна арганізавала разам з загадчыцай клуба Валянцінай Ладэсавай і настаўнікамі школы. На вечары чыталіся вершы, урыўкі з апавяданняў аб Леніне, з успамінаў аб ім яго паплечнікаў, гучалі любімыя песні Ільіча, дэманстраваліся карціны савецкіх мастакоў.

Шмат увагі ўдзяляе Аляксандра Райдудзіна прапагандзе атэістычнай і сельскагаспадарчай літаратуры. Часта ў бібліятэцы наладжваюцца выстаўкі, агляды кніг, чытанні, абмеркаванні артыкулаў з часопіса «Сельская гаспадарка Беларусі» і газет.

В. ДАЎГАЛЁЎ.

Хоцімскі раён.

ЗДЫМАЮЦЬ ФОТААМАТАРЫ

ЧАЛАВЕК ЗАХВАРЭЎ. Фотаэцюд А. КУДРАЎЦАВА.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

Іван Аношкін. Алёнчын сакрэт. Апавяданні. Мастак І. Андрыянаў. 1969 г. Тыраж 40.000 экз. 56 стар. Цана 12 кап.

В. І. Аркашоў. Франтавымі дарогамі. Фотаальбом. Аўтар тэксту пад фатаграфіямі А. Вялюгін. На беларускай і рускай мовах. 1969 г. Тыраж 12.000 экз. Цана 1 руб. 70 кап.

В. Ждановіч. Ад вясны да лістапада (Бярэзінскі запаведнік). Альбом. На беларускай, рускай і англійскай мовах. Мастак П. Драчоў. 1969 г. Тыраж 10.000 экз. Цана 1 руб. 57 кап.

Вольга Іпатава. Раніца. Першая кніга паэта. Мастак В. Жыжэнка. 1969 г. Тыраж 4.500 экз. 80 стар. Цана 15 кап.

Р. Мачульскі. Вечны агонь. Партызанскія запіскі. 2-е выпраўленае і дапоўненае выданне. Літаратурная апрацоўка А. Коласава. Мастак Б. Забораў. На рускай мове. 1969 г. Тыраж 75.000 экз. 464 стар. Цана 95 кап.

© PDF: Kamunikat.org 2023
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

АЎТАР ФІЛЬМАЎ — ЧАС

Уладзімір СУРЫН,
генеральны дырэктар кінастудыі «Масфільм»

ЧАС прымушае наша мастацтва быць па-сапраўднаму актыўным у сцвярджэнні дарагіх нам усім рэвалюцыйных ідэалаў, у стварэнні вобразаў, якія нясуць ідэі гуманізму, грамадзянскай страснасці, камуністычнай ідэйнасці. Мы, кінематаграфісты, павінны яшчэ і яшчэ раз сказаць свету (але, вядома, кожны раз па-новаму, адкрываючы новыя магчымасці, новыя формы кінамовы) пра тое, якія яны, людзі новага грамадства, што па ленінскіх планах будуюць сваё жыццё, якія іх прынцыпы, погляды, характар іх узаемаадносін.

Творчы калектыў «Масфільма», буйнейшай студыі краіны, бачыць сваю задачу ў тым, каб ствараць кінафільмы, якія праўдзіва паказваюць перамогі нашага народа ў мінулым і цяпер. Мы імкнёмся глыбей разабрацца ў выніках нашай сённяшняй працы, заглянуць у заўтрашні дзень, цвяроза ацаніць свае дасягненні і пралікі.

Набліжаецца знамянальная дата — 100-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Велізарнае значэнне мае гэта дата і для майстроў экрана. Ясна, што ленінскі фільм — гэта не ўрачыста напісаны партрэт для парадная галерэі. Гэта наша зброя ў барацьбе за сцвярджэнне камуністычных ідэалаў.

Не так даўно выйшаў на экраны фільм «Шостае ліпеня», пастаўлены рэжысёрам Юліем Карасікам па сцэнарыі Міхаіла Шатрова. Гэтая карціна, у якой ярка і хвалююча расказваецца пра тое, як пад кіраўніцтвам Леніна летам васемнаццатага года быў ліквідаваны небяспечны мяцеж левых эсэраў, цёпла сустрэта гледачамі. Артысту Юрыю Каюраву ўдалося стварыць хвалюючы вобраз Леніна — валявога, засяроджанага на рашэнні вельмі складанай задачы, Леніна, які мудра і цвяроза ацэньвае небяспечную для рэвалюцыі сітуацыю.

Зараз Юлій Карасік распачаў работу над новай карцінай «Ленін, год 1903». Яна прысвечана падзеям, звязаным з гісторыяй стварэння бальшавіцкай партыі. На экране будуць паказаны старонкі барацьбы Леніна за чысціню і маналітнасць радоў партыі, расказана, як падрыхтоўваўся і ў якіх складаных умовах праходзіў гістарычны Другі з'езд РСДРП.

«Цягнік ў заўтрашні дзень» — так будзе называцца стужка, здымаць якую пачынае рэжысёр Вілен Азараў. У аснову яе пакладзена важная падзея, звязаная з пераездам савецкага ўрада на чале з Леніным з Петраграда ў Маскву. У час гэтага падарожжа, на той час дастаткова небяспечнага, Ільіч не толькі думаў пра лёс Савецкай Расіі, але і напісаў адзін са сваіх важных артыкулаў, у якім намеціў праграму будучых работ.

Шырокай вядомасцю карыстаецца п'еса Мікалая Пагодзіна «Крамлёўскія куранты». Мы хочам экранізаваць гэты цікавы твор савецкай драматургіі. У ім вельмі ярка дадзены вобраз Ільіча, пад кіраўніцтвам якога краіна рабіла першыя крокі на шляху аднаўлення разбуранай народнай гаспадаркі.

Намі задумана яшчэ адна карціна, якая, бадай што, будзе не падобная на тое, што дагэтуль рабілася. Пакуль што яшчэ цяжка вызначыць жанр гэтага фільма. Ва ўсякім разе, мы называем яго кінаанталогіяй, прысвечанай Леніну. У фільм павінны ўвайсці спаяныя адзінай мастацкай задумай фрагменты з лепшых стужак кіналенініяны. Вядомы кінарэжысёр Міхаіл Ром пажадаў заняцца гэтай значнай і захапляючай працай.

Вельмі важна расказаць і аб паплечніках Уладзіміра Ільіча, аб людзях, якія ажыццяўлялі яго планы, усе свае веды, сілы, вопыт аддавалі абароне заваёў Кастрычніка. Адзін з такіх фільмаў — «Крах». У ім мы сустракаемся з Феліксам Эдмундавічам Дзяржынскім, рыцарам рэвалюцыі, пад кіраўніцтвам якога праводзіцца аперацыя супраць аднаго з самых злых ворагаў маладой Рэспублікі Саветаў Барыса Савінкава. Гэта аперацыя мела велізарны палітычны рэзананс, садзейнічала ўмацаванню бяспекі першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян. Стварыў фільм рэжысёр Уладзімір Чабатароў.

Вялікую ролю ў нашай гісторыі выпала адыграць дыпламатам ленінскай школы. Адзін з іх—Аляксандра Калантай. Ёй і прысвячаецца фільм «Пасол Савецкага Саюза», які раскажа аб жыцці і дзейнасці славутай жанчыны-дыпламата, якая беззапаветна аддала сябе рабоце на гэтым вельмі цяжкім і складаным пасту. Фільм ставіць рэжысёр Георгій Натансон.

Аб тым, як ствараліся Савецкія Узброеныя Сілы, наша слаўная Чырвоная Армія, будзе расказана ў фільме «Красная плошча» (рэжысёр Васілій Ардынскі). Адным з цэнтральных эпізодаў карціны стане выступленне Леніна перад байцамі на Краснай плошчы, яго заклік да самаадданай абароны сацыялістычнай айчыны, які знайшоў гарачы водгук у сэрцах мільёнаў рабочых і сялян. Кінарасказ прысвечаны лёсу аднаго з палкоў царскай арміі, які бальшавікам-ленінцам удалося ператварыць у адно з першых фарміраванняў Чырвонай Арміі, надзейнага абаронцу рэвалюцыі.

Слаўныя традыцыі воінаў рэвалюцыі прадоўжаны на палях бітваў Вялікай Айчыннай вайны іх сынамі і ўнукамі—салдатамі і афіцэрамі Савецкай Арміі, якія ў суровых баях разграмілі моцнага і хітрага ворага. На студыі завершана работа над фільмамі «Вогненная дуга» і «Прарыў» з цыкла «Вызваленне Еўропы» (рэжысёр Юрый Озераў). Гэта маштабныя творы, якія ахопліваюць важныя падзеі мінулай вайны. Цяпер ідзе падрыхтоўка да стварэння шырокафарматнага фільма «Узяцце Берліна», які і завершыць нашу кінаэпапею «Вызваленне Еўропы».

Неўзабаве будзе закончаны фільм «Дырэктар», які па сцэнарыі Юрыя Нагібіна ставіць рэжысёр Аляксей Салтыкоў. Прататыпам героя гэтай карціны з'яўляецца вядомы арганізатар айчыннага аўтамабілебудавання, былы рабочы, а пасля дырэктар Маскоўскага аўтазавода Іван Ліхачоў. Гэты фільм аб рабочым класе маладой Савецкай рэспублікі, натхненне і энтузіязм якога далі магчымасць паспяхова вырашыць многія складаныя народнагаспадарчыя праблемы часу.

Тэма рабочага класа, яго жыццё і самаадданая праца — адна з самых важных у сучасным савецкім кінамастацтве. Цяпер у павільёнах студыі здымаецца фільм «Самая шчаслівая». Героі карціны — маладыя рабочыя, якія ўдзельнічаюць у будаўніцтве буйнога прамысловага прадпрыемства ў Карэліі. Ставіць карціну рэжысёр Аляксандр Сурын, які бачыць сваю мэту ў тым, каб як мага глыбей раскрыць характары нашых маладых сучаснікаў — людзей працы, пранікнуць у свет іх мар і дум.

«Рэха далёкіх снягоў» — карціна пра геолагаў — вучоных і рабочых, якія пракладваюць шляхі для магістраляў будучага. Гэта людзі паўсядзённага непрыкметнага подзвігу, простыя і мужныя, якія вышэй за ўсё ўмеюць цаніць сапраўднае таварыства. Малады рэжысёр Леанід Галаўня мае магчымасць на цікавым жыццёвым матэрыяле зрабіць фільм на сучасную тэму.

У творчай праграме нашай студыі — шмат твораў, над якімі працуюць майстры ўсіх пакаленняў — і сівыя, і зусім маладыя, што робяць свае першыя крокі ў кінематографе. Але якая б ні была тэма фільма, мастак імкнецца рашыць яе з пазіцый сучаснасці, зрабіць у лепшым сэнсе слова сугучнай нашаму часу, нашай эпосе.

(АДН).

Госці Мінска

ПЕСНЯ ІШЛА З САЛДАТАМ



Выступае Цэнтральны мастацкі ансамбль Войска Польскага.

У сувязі са знамянальнай датай у жыцці братняга польскага народа — 25-годдзем Польскай Народнай Рэспублікі, якое спаўняецца 22 ліпеня гэтага года, у нашай краіне праходзіць месячнік польскай культуры. Заключная частка месячніка праводзіцца на Беларусі, куды разам з вялікай групай дзеячоў літаратуры і мастацтва ПНР прыехаў Цэнтральны мастацкі ансамбль Войска Польскага.

Наша грамадскасць з асаблівай прыемнасцю і цеплынёй сустракае выдатны мастацкі калектыў братняй Польшчы. Гэта ж на беларускай зямлі, пад вёскай Леніна ў Горацкім раёне на Магілёўшчыне, упершыню ўступіла ў бой супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў польская дывізія імя Тадэвуша Касцюшкі, з якой пачынаецца гісторыя Узброеных Сіл ПНР. Мастацкі ансамбль Войска Польскага — дзіця незабыўных герояў тых гістарычных дзён у жыцці польскага і савецкага народаў.

У гутарцы з карэспандэнтам «Літаратуры і мастацтва» начальнік калектыву палкоўнік Польскай Арміі Казімеж Магноўскі і прадстаўнік Галоўнага палітычнага ўпраўлення Польскіх Узброеных Сіл палкоўнік Тадэвуш Козел расказалі, што за 25 гадоў ансамбль Войска Польскага даў больш васьмі з паловай тысяч канцэртаў, на якіх прысутнічала больш за 10 мільёнаў слухачоў. Ансамбль быў неаднаразова на гастролях ва ўсіх сацыялістычных краінах і ў Францыі.

За гады свайго існавання Цэнтральны мастацкі ансамбль прайшоў цікавы творчы шлях — ад выканання ў праграмах асобных песень і танцаў да стварэння буйных тэатралізаваных праграм-спектакляў.

— Тая праграма, — гавораць кіраўнікі ансамбля, — якую мы пакажам мінчанам, з'яўляецца своеасаблівым спектаклем-аглядам песні, танца, сцэнічных касцюмаў Польскай арміі ад XVII стагоддзя да нашых дзён. Праграму мы назвалі «Цудоўная наша Польская краіна». Калі першая частка спектакля прысвечана гістарычнай славе польскай зброі, дык другая апавядае пра пачатак апошняй сусветнай вайны, пра барацьбу за новую Польшчу і пра сённяшні дзень Польскай Народнай Рэспублікі.

— Для нас, — гаворыць палкоўнік К. Магноўскі, — ваенная культура — неадрыўная частка вялікай культуры польскага народа, і гэтай думкай прасякнуты ўсе праграмы Цэнтральнага мастацкага ансамбля.

Самае шчырае жаданне ўсіх удзельнікаў калектыву, гавораць К. Магноўскі і Т. Козел, каб канцэрты-спектаклі, што мы даём, спрыялі дружбе і ўзаемаразуменню між нашымі братнімі народамі і іх узброенымі сіламі. Мы шчыра верым, што нашы праграмы будуць садзейнічаць захаванню ў памяці моладзі і будучых пакаленняў палякаў гераічных подзвігаў Савецкай Арміі, якая дапамагла нам выратаваць польскі народ ад знішчэння фашысцкімі захопнікамі. Мы верым, што нашы праграмы дапамогуць захаваць удзячнасць і любоў польскага народа да Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савецкага ўрада, якія зрабілі ўсё, каб існавала Польская Народная Рэспубліка — свабодная і суверэнная дзяржава польскіх рабочых і сялян.

СВЕТ Хемінгуэя

ДА 70-й ГАДАВІНЫ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Яго спадарожнікамі ў жыцці былі салдаты і рыбакі, газетчыкі і тарэра, спартсмены і мастакі, афрыканскія паляўнічыя і простыя парыжане, рэспубліканцы Іспаніі і рэвалюцыянеры Кубы...

Сярод сваіх духоўных настаўнікаў ён называў Льва Талстога і Івана Тургенева...

Ён цалкам зведаў, як «цяжка знайсці сапраўдныя словы»...

Нават калі б ён быў аўтарам толькі двух публіцыстычных твораў — «Памяці амерыканцаў, якія загінулі за Іспанію» і «Пісьменнік і вайна» — і тады б, здаецца мне, імя яго засталося несмяротнае...

Але ж мы атрымалі такія шэдэўры, як «Стары і мора», «Свята, якое заўжды з табой», «І ўзыходзіць сонца» («Фіеста»), «Непераможаны», «Снягі Кіліманджара», «Бывай, зброя», «Па кім звоніць звон»... Дзесяткі, сотні старонак прозы, крыштальна празрыстай, важкай, аб'ёмнай, поўнай водару жыцця — з усёй яго складанасцю, з усёй яго логікай развіцця і перамогі чалавечнага ў чалавеку і ў чалавецтве. А спіс яго твораў пакуль што няпоўны— убачыла свет яшчэ не ўсё з літаратурнай спадчыны пісьменніка.

Нянавісць да несправядлівай вайны, нянавісць да фашызму, як да злаякаснай пухліны на сацыяльным арганізме, нянавісць да «акул» капіталістычнага свету — іменна яна, гэтая нянавісць, памагае зразумець логіку жыццёвых шляхоў Эрнеста Хемінгуэя, якія прыводзілі яго на франты першай і другой сусветных войнаў, у рэспубліканскую Іспанію, на Кубу, іменна яна памагае ўявіць сабе «дзевяць дзесятых айсберга» жыцця пісьменніка, што заняў такое вялікае месца ў духоўным жыцці чалавецтва.

Сёлета 21 ліпеня яму было б 70 гадоў, гэтаму чалавеку, які не ведаў кампрамісаў са сваім сумленнем, чалавеку, які імкнуўся, каб яго словы (а ён быў вельмі скупы на іх) не разыходзіліся са справай.

Творчасць Хемінгуэя і яго жыццё (з усімі іх супярэчнасцямі) — гэта вялікі свет, уваходзячы ў які дыхаеш на поўныя грудзі, адчуваеш, што думка і пачуццё абвастраюцца.

У свеце Хемінгуэя жывуць салдаты і газетчыкі, тарэра і паляўнічыя, рэвалюцыянеры і мастакі— людзі, пра якіх і дзеля якіх пісьменніку ўдалося знайсці «сапраўдныя словы»...

Ул. БОЙКА.

Мікалай РЫЛЕНКАЎ

ГОЛАС СУМЛЕННЯ

Незадоўга да смерці Мікалая Рыленкава з ім сустрэўся карэспандэнт АДН. Мікалай Рыленкаў лірык, блізкі да прыроды, да людзей, іх працы, клопатаў, радасці і смутку... Яго вершы—голас сумлення паэта. За чатыры дзесяцігоддзі сваёй літаратурнай дзейнасці ён выпусціў больш як сорак паэтычных і празаічных зборнікаў, мноства артыкулаў аб літаратуры і паэзіі. На гэтай сустрэчы і ішла гутарка аб пісьменніках, аб іх адказнасці перад народам. Рыленкаў многа расказваў і аб сабе, аб сваёй творчасці. На жаль, гэта інтэрв'ю ўбачыць свет толькі пасля смерці паэта.

Тое, што расказаў аб сабе Мікалай Рыленкаў, мы прапануем увазе чытачоў у запісе карэспандэнта АДН Тамары Залатухінай.

У КОЖНАГА чалавека, які пераступіў пэўны ўзроставы рубеж, узнікае патрэба азірнуцца на пройдзены шлях, асэнсаваць перажытае, адказаць сабе, чаму выбраў у жыцці тыя, а не іншыя дарогі.

Паэты ў такім ўзросце звычайна звяртаюцца да лірыкі ўспамінаў. Каб не паўтараць самога сябе, я хацеў бы расказаць толькі аб тым, што ва мне абудзіла любоў да паэзіі, да роднага слова, чым навеяны тыя ці іншыя матывы маіх вершаў.

Калі я ўспамінаю сваё ранняе дзяцінства, мне бачыцца глухі Смаленскі край дарэвалюцыйнай пары.

ПАХІ ПРЫРОДЫ

Вёска Аляксееўка, дзе аралі зямлю мае бацькі і дзе гадаваўся я, была адным з самых глухіх куткоў лясного Раслаўскага павета. У гады майго маленства ў ёй не было і паўсотні двароў. Адразу за ваколіцай пачыналіся дрымучыя лясы. Вясной, выбегшы раніцай на ганак, мы чулі такаванне цецерукоў, а ў глухі зімні змрок — выццё галодных ваўкоў. Улетку на нашы яравыя палеткі выходзілі паласавацца аўсом мядзведзі. А ўсялякай іншай дробнай звярыны за рэчкай Карчоўкай, якая аддзяляла нашы палі ад казённых лясных дзялянак, вадзілася безліч. Аднак амаль ніхто не паляваў, а тыя, хто хадзіў з ружжом, не лічыліся добрымі гаспадарамі. Потым я не раз пераконваўся, што людзі, звязаныя з зямлёй, якія жывуць на прыродзе, адносяцца да яе пасвойску, з нейкай дзівоснай цнатлівай прастатой. Яны нікалі не захапляюцца ўголас яе хараством, але затое і не дазваляюць ставіцца да яе лёгкадумна.

У народзе лічыцца, што замуціць крыніцу — гэта тое самае, што плюнуць у вочы маці. Гэта я засвоіў з дзяцінства, засвоіў на ўсё жыццё. Аб усім гэтым я падрабязна расказаў у сваёй аповесці «Казка майго дзяцінства» і дадаць да яе мне няма чаго.

Калі ў мяне склаліся першыя рыфмаваныя радкі, я не памятаю. Але захапляўся вершамі яшчэ да таго, калі навучыўся пісьменнасці, прымушаючы бацьку бясконца паўтараць то «Песню аратага» Кальцова, то «Песню бабыля» Нікіціна. Гэтыя паэты былі маімі першымі настаўнікамі. Ды яно і зразумела. Свет іх паэзіі быў блізкі мне светам сельскіх працаўнікоў, роднай прыроды.

У Цюнінскай працоўнай школе, дзе я вучыўся, зачытваўся Буніным і Блокам, завучваў напамяць кожны новы верш Ясеніна.

У сваіх ранніх вершах, хай тады яшчэ зусім несвядома, я нязменна імкнуўся выказаць «разводдзе пачуццяў» сваіх равеснікаў, якія ўпершыню атрымалі магчымасць думаць не толькі аб кавалку хлеба, але і аб прыгажосці роднай зямлі.

Напісанае не задавальняла. Вялікай падтрымкай былі пісьмы Міхаіла Ісакоўскага, у той час ужо вядомага паэта. Ён, падхопліваючы кожны ўдалы радок у маіх вершах, бязлітасна высмейваў цягу да квяцістасці, да слоўных мудрагельстваў.

Я ўсё больш разумеў, што для паспяховай работы ў паэзіі мне не хапае культуры, і я паступіў на літаратурнае аддзяленне Смаленскага педагагічнага інстытута.

У тое лета ў мяне гасцілі паэт Аляксандр Твардоўскі і крытык Андрыян Македонаў.

Твардоўскі чытаў новыя раздзелы паэмы «Шлях да сацыялізма», над якой ён тады працаваў. Гэта паэма была яго першым подступам да тэмы калектывізацыі. Вёску ён ведаў выдатна, адчуваў яе, як кажуць, скурай.

У 1938 годзе Дзяржпалітвыдат выпусціў кнігу маіх выбраных вершаў «Дыханне». Гэта быў трэці паэтычны зборнік.

У перадваенныя гады, калі ў паветры ўжо адчуваўся пах навальніцы, мяне захапіла гераічная гісторыя Смаленска, нездарма названага «каменным шчытом дзяржавы Маскоўскай». Я напісаў дзве невялікія гістарычныя паэмы «Скамарох Аўсей Калабок» — аб мужнасці простых рускіх людзей у барацьбе з іншаземнымі захопнікамі ў эпоху так званага смутнага часу, і «Вялікая замятня» — аб паўстанні смаленскіх чорных людзей у XIV стагоддзі. Абедзьве гэтыя паэмы ўвайшлі ў зборнік «Бярозавы пералесак», які я лічу лепшай з маіх даваенных кніг, хоць пры з'яўленні яна была жорстка аблаяна крытыкай. Адзіная добразычлівая рэцэнзія на яе з'явілася ў «Новым міры». Я ж пісаў аб такіх «неактуальных» рэчах, як каханне, дружба, вернасць, родная прырода, гісторыя...

НА АПАЛЕНАЙ ЗЯМЛІ

У першыя ж дні вайны, калі Смаленск на маіх вачах быў ператвораны ў руіны, я пайшоў добраахвотнікам на фронт, захапіўшы з сабой анталогію сучаснай сусветнай паэзіі, выдадзеную ў Кіеве ў 1912 годзе, кніжку выбранай лірыкі Гейнэ і трэці том прыжыццёвага выдання Блока з вершамі аб Расіі. Гэтыя кнігі былі са мной неразлучна. Я пранёс іх у палявой сумцы па ўсіх франтавых дарогах. Толькі яны і засталіся ў мяне ад даваеннай бібліятэкі, якую я пачаў збіраць яшчэ студэнтам. Цяпер гэтыя кнігі я захоўваю як самыя дарагія рэліквіі.

На фронце я камандаваў узводам у сапёрным батальёне, міныраваў і размініраваў палі, капаў процітанкавыя рвы, будаваў умацаванні, а па начах у зямлянцы, у прамежках паміж бамбёжкамі, пісаў вершы, не думаючы аб магчымасці іх надрукаваць. У гэтых вершах, якія ўвайшлі ў зборнікі «Сіняе віно» і «Развітанне з юнацтвам», я ўпершыню загаварыў поўным голасам узрушанай свядомасці, абуранага сумлення. Да мяне як бы само сабой прыйшло ўсё тое, да чаго я даўно імкнуўся і што лічу галоўным у паэзіі, — поўнае і арганічнае зліццё асабістых і грамадскіх матываў.

Да канца дзён не забыць мне сустрэчы з любімым горадам, у якім я не мог пазнаць знаёмых з юнацтва мясцін. Але я бачыў не толькі зарослыя бур'янам пустэчы з комінамі згарэлых дамоў над імі, я бачыў людзей, якія туліліся ў зямлянках і ў амбразурах старажытнай крапаснойсцяны, якія працавалі пад бамбёжкамі дзень і ноч, людзей, гатовых падзяліцца апошнім кавалкам хлеба з землякамі, якія вярталіся на родныя папялішчы.

Аб гэтым я расказаў, як мог, у паэме «Вяртанне» і ў аповесці «Ля раскіданага гнязда».

КАБ СЛОВА ДАПАМАГЛО ЛЮДЗЯМ

У апошнія гады я многа ездзіў па краіне. Мне давялося пабываць у стэпах Казахстана і на палях Украіны, у гарадах і сёлах Літвы і Таджыкістана, Беларусі і Грузіі, Бураціі і Мардовіі.

Я прыняў у сэрца ўсю іх своеасаблівую прыгажосць. Гэтая прыгажосць узбагаціла мяне, але не зацямніла мілага сэрцу хараства родных мне мясц сярэдняй Расіі. Я заўсёды з удзячнасцю буду ўспамінаць гадзіны і дні святочных сустрэч з сябрамі на берагах Байкала або ля падножжа снежных вяршынь Каўказа, але абдумваць перажытае прыйду на бераг якой-небудзь безыменнай рачулкі ў глыбіні Смаленшчыны.

Я па-ранейшаму многа пішу аб прыродзе, а прырода для мяне — люстэрка, у якім відна душа чалавека з усімі яго марамі і клопатамі, радасцямі і засмучэннямі.

Адна з маіх апошніх кніг — «Сняжніца». У ёй руская прырода, роздумы аб лёсе чалавечым, аб жыцці. Складзена гэтая кніга, як і ўсе іншыя, не простым механічным падборам вершаў. У кожнага мастака ёсць свая скразная тэма, якая праходзіць і вар'іруецца праз усё яго жыццё. Тое, што раней не заўважалася, прыходзіць інакш. Іншымі словамі — незвычайнае ў звычайным.

Мне не раз на сваім вопыце даводзілася пераконвацца, што сапраўдныя ўдачы чакаюць мастака там, дзе яго асабісты лёс цалкам зліваецца з лёсам народа, дзе, выказваючы сябе, ён выказвае час. І аб чым бы я ні пісаў, у меру маіх сіл стараўся знайсці такое слова, якое дапамагло б людзям.

Я не ведаю, якой будзе тая самая галоўная кніга, якая заўсёды наперадзе, але, аглядваючыся на пройдзены шлях, спакойна магу сказаць:

Я многое делал не так,
как бы сделал теперь я,
Но делал лишь то,
что по совести делать я мог.

У апошнія гады Мікалай Рыленкаў многа працаваў над кнігай аб рускай паэзіі. Яна ўжо гатова, і чытач яе ўбачыць. На жаль, не ўбачыць яе паэт. Мікалай Іванавіч даў ёй назву «Душа паэзіі». Размова ў ёй ідзе аб паэтычным майстэрстве, пачынаючы са «Слова аб палку Ігаравым» (якое ён цудоўна пераклаў) і Ламаносава да нашых дзён. У кнігу ўвайшлі артыкулы пра Лермантава, Пушкіна, Някрасава, Блока, Ясеніна, Пастэрнака, Ахматаву...

— З гэтай кнігай я зрадніўся, і мне будзе шкада з ёй расставацца. У ёй мой роздум аб лёсе народа, аб лёсе літаратуры, аб грамадзянскасці ў паэзіі. Многа ўвагі аддаю тэме — Радзіма. Думаю, што ні ў адной другой літаратуры гэта тэма не займае такога месца, як у нашай рускай савецкай паэзіі. І гэта знамянальна.

Любоўю да Радзімы, шырынёй мыслення, адточанасцю паэтычнага майстэрства, глыбокім веданнем жыцця заваяваў паэт прызнанне чытача.

КНІГА ПРЫХОДЗІЦЬ У ЦЭХ

У гэтай кнігарні ўсё, як і ў многіх іншых. Тут багаты выбар разнастайнай друкаванай прадукцыі. Ёсць палітычная, мастацкая, тэхнічная літаратура, паштоўкі, маркі для аматараў філатэліі. Ёсць у кнігарні і загадчыца — Валянціна Мядзвецкая і сем прадаўцоў. Толькі яны за сваю работу не атрымліваюць заработнай платы.

Усё ў тым, што кнігарня працуе на грамадскіх пачатках. Яна адкрыта на Магілёўскім заводзе імя С. М. Кірава. Ініцыятар яе адкрыцця — канструктар Валянціна Мядзвецкая. Яна падабрала дзяўчат-кнігалюбаў і стварыла савет кнігарні. У яго ўвайшлі напіроўшчыцы сёстры Галіна і Людміла Вароніны, а таксама іх сяброўкі па працы Н. Вяржбіцкая, Т. Мартынава, Г. Кацельнічава, Т. Кір'янава і Л. Іваненка. Яны і працуюць тут па чарзе ў свабодны ад асноўнай работы час. І працуюць не абы як, а з ахвотай, з любоўю, прывіваюць гэтую любоў да кнігі рабочым прадпрыемства. Дзякуючы іх клопатам многія рабочыя папоўнілі свае бібліятэчкі. Сяброўкі не толькі прадаюць кнігі, але прымаюць заяўкі на іх. Больш таго, у абедзенны перапынак яны разносяць і прадаюць кнігі непасрэдна ў цэхах і аддзелах.

Днямі Валя Мядзвецкая паведаміла ў аблкнігагандаль: датэрмінова выкананы дзевяцімесячны план рэалізацыі літаратуры.

І. САЎЧУК.

БЕЛАРУСІСТЫКА НА СТАРОНКАХ „SLAVIA ORIENTALIS“

Шмат старонак аддае беларусістыцы штоквартальны часопіс «Slavia Orientalis» — орган Камітэта славяназнаўства Польскай акадэміі навук. Амаль у кожным нумары друкуюцца матэрыялы, звязаныя з Беларуссю. Толькі ў мінулым годзе тут было змешчана каля дзесяці артыкулаў, прысвечаных беларускай мове і літаратуры. Сярод іх — «Аб беларускіх дыялектных рысах заходняга паграніччa» Г. Арашонкавай і Ю. Мацкевіч, «Аб развіцці недысімілятыўнага акання ў беларускіх гаворках» Н. Вайтовіч, «Акцэнтацыя і камбінаторыка галосных польскай гаворкі ў Палессі» В. Вярэніча, «Заўвагі аб моўных асаблівасцях «Дзённіка Ф. Еўлашэўскага» А. Жураўскага, «Дадзеныя сказы акалічнасці месца ў беларускай мове» А. Груцо, «З назіранняў над беларускай лексікай» Э. Смулковай, «Фразеалагізмы ў томе VI «Ludu bialoruskiego» Міхаіла Федароўскага» Ф. Янкоўскага, «Назва ракі Прыпяць» У. Курашкевіча, «Найдаўнейшы беларускі свецкі друк» П. Зваліньскага. З іх артыкулы Г. Арашонкавай і Ю. Мацкевіч, Н. Вайтовіч, В. Вярэніча, А. Жураўскага, Ф. Янкоўскага друкаваліся ў «Slavia Orientalis» на беларускай мове.

У часопісе былі змешчаны рэцэнзіі Ф. Сляцкага на маскоўскае выданне «Хронікі Быхаўца» (з прадмовай, каментарыямі і перакладам М. Улашчыка) і Э. Смулковай на «Беларускае мовазнаўства. Бібліяграфічны ўказальнік (1825—1965)».

У новым, першым нумары за гэты год часопіс змяшчае артыкул Э. Смулковай «Лексічныя і словаўтваральныя асаблівасці беларускіх назваў Іржышча».

З. КЛЫШКА.

УКРАІНСКІЯ НАРОДНЫЯ ПІСАНКІ

Выстаўка ў Адэсе незвычайная — яе экспанаты, якія пераліваюцца радаснай шматколернасцю ў шафах і вітрынах, аднолькавыя па форме, вельмі крохкія і прыгожыя.

Выстаўка называецца «Украінскія народныя пісанкі». Пісанкі — распісныя курыныя яйкі — адзін з распаўсюджаных відаў народнага дэкаратыўнага мастацтва, вытокі якога бяруць пачатак у сівой мінуўшчыне паганскіх часоў. Як усякі від мастацтва, яны з'яўляюцца прадметам вывучэння і збіральніцтва. Збіраюць іх музеі і калекцыянеры.

Тры ўдзельнікі адэскай выстаўкі, выкладчык Пятро Маркушэўскі, паэт Валянцін Мароз і інжынер Тарас Максімюк, сабралі каля 700 пісанак з дваццаці абласцей Украіны. Збіралі ў час турысцкіх паездак і камандзіровак, абменьваліся з аматарамі іншых гарадоў.

У кожнай вобласці свае ўлюбёныя арнаментальныя матывы — раслінныя, геаметрычныя; іншы раз у карункавую вязь роспісу ўплятаюцца малюнкі коней, аленяў, птушак. У кожнай вобласці свая ўлюбёная каляровая гама, але як бы пісанкі ні адрозніваліся або збліжаліся па дэкоры, у іх нязменна здзіўляе сакавітасць і яркая прыгажосць фарбаў.

Гэтыя рысы ў першую чаргу родняць іх з украінскай народнай керамікай, дыванаткацтвам, вышыўкай, разьбой па дрэве.

Існуе звычай дарыць пісанкі вясной як сімвал абуджэння прыроды, пачатку сельскагаспадарчых работ, як знак шчырай прыхільнасці.

Кожную вясну жыхары вёскі Крываруўня прыносяць у дом-музей вялікага ўкраінскага пісьменніка Івана Франко лепшыя пісанкі, выказваючы гэтым сваю павагу і любоў.

На выстаўцы «Украінскія народныя пісанкі» ёсць кніга водгукаў. Часцей за ўсё ў ёй кароткі запіс: «Дзякуй за прыгажосць».

Дзякуюць калекцыянерам, дзякуюць адэскай арганізацыі Украінскага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Дзякуюць тым, у большай частцы безыменных умельцаў, у чыіх мініяцюрных творах раскрываюцца талент і высокі мастацкі густ украінскага народа.

Аўгуста ТАРАДАШ.
(АДН).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

18 ліпеня

Першая праграма. 10-00 — навіны (М). 10-15 — для дзяцей. «Цуды прыроды». Перадача з Калінінграда. 10-30 — «Дванаццатая ноч». Мастацкі фільм (М). 12-00— для дзяцей. «Свеціць зорачка» (М). 16-45 — праграма перадач. 16-50 — навіны (М). 17-00 — канцэрт класічнай музыкі. Перадача з Ленінграда. 17-30 — «Клічуць дарогі далёкія». Турысцкі альманах (М). 18-00 — для дзяцей. «Запрашэнне да танца». Канцэрт народнага дзіцячага харэаграфічнага ансамбля Палаца культуры маскоўскага завода імя Ліхачова. 18-45—«Панарама навін». 19-00— праграма каляровага тэлебачання. Мальер. «Шлюб паняволі». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 20-15 — «Эстафета навін» (М). 21-00 — «На экране цырка» (М). 22-00 — На VI Міжнародным кінафестывалі ў Маскве. «Мастак і час» (М). 23-00 — чэмпіянат СССР па коннымі спорце (М). 23-30 — навіны.

Другая праграма. 18-00 — «На зямлі чарапавецкай». Тэлефільм (М). 18-30 — «Радзіма». Тэлеальманах (М). 21-00 — В. Гюго. «Руі-Блаз». Спектакль Нікалаеўскага драматычнага тэатра імя В. Чкалава.

19 ліпеня

Першая праграма. 8-55 — праграма перадач. 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9.45 — навіны (М). 10-00 — «Будзьце шчаслівыя». Музычная вясёлая праграма (М). 10-30 — «Гаспадарчая рэформа ў дзеянні». Перадача з Ленінграда. 11-00 — для дзяцей. «Як самому зрабіць цацкі». 11-30 —«Піянерыя». Кіначасопіс. 11-40 — «Музычная шкатулка». 12-00 — «Тыдзень планеты». Міжнародны агляд. 12-20 — Дні культуры Польскай Народнай Рэспублікі ў СССР. «Экран нашых сяброў». Кінарэжысёр Анджэй Вайда. 13-00— «Дарогай бацькоў-герояў». З гісторыі беларускага сяла Языль. 13-30 —Дні культуры Польскай Народнай Рэспублікі ў СССР. «Раён ці невядомы горад». Перадача з Польшчы. 14-00 — «У свеце слоў, вобразаў, фарбаў». Тэлевізійны альманах. 15-00 — дзіцячы экран. «Марскі воўк». Казка для вялікіх і малечых». Мультыплікацыйныя фільмы. 15-30 — праграма каляровага тэлебачання. 1. Для дзяцей. «Першыя крокі». Мультыплікацыйны фільм. 2. «Сляпы музыкант». Мастацкі фільм (М). 17-00 — «Сельскі клуб» (М). 18-00 — Тыдзень Польскага тэлебачання. «Масква — Варшава». Тэлевізійная пераклічка (М). 19-00 —Дні культуры Польскай Народнай Рэспублікі ў СССР. «Стаўка, большая за жыццё». Тэлевізійны шматсерыйны мастацкі фільм. 10-я серыя (М). 20-00 — навіны (М). 20-15 — «Чалавек кідае якар». Мастацкі фільм (М). 21-30 — «Свет сацыялізма» (М). 22-00 — Тыдзень Польскага тэлебачання. «На агеньчык». Сумесная перадача тэлебачання Польшчы і СССР (М). 23-15 —канцэрт Малдаўскага ансамбля народнай музыкі «Флуэраш». Перадача з Кішынёва. 23-45—«Толькі факты».

20 ліпеня

Першая праграма. 8-55 — праграма перадач. 9-00 — «На зарадку становісь!» (М). 9-15 — навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — «Музычны кіёск» (М). 10-30 — для юнацтва «Шукальнікі» (М). 11-30 — «Сёння — Дзень металурга» (М). 12-15 — навіны (М). 12-30 — «Сельская гадзіна» (М). 13-30 — у свеце мастацтваў. «Замак Тракай». Перадача з Вільнюса. 14-00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту (М). 14-30 — «Расказы пра Матэ Залка». Тэлевізійны фільм. 15-40 — «Соф'я Пяроўская». Мастацкі фільм. 17-30 —праграма каляровага тэлебачання. «Клуб кінападарожнікаў» (М). 18-30 — Дні культуры Польскай Народнай Рэспублікі ў СССР. «Стаўка, большая за жыццё». Тэлевізійны шматсерыйны мастацкі фільм. 11-я серыя (М). 19-30 — праграма каляровага тэлебачання. Кубак СССР па футболе. Паўфінал (М). 22-00 — «Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 22-30 —«Любімыя спевакі». Ян Кіпура (М). 23-30 — «Спартыўны тыдзень» (М).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.
«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.
НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.
«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.
Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 03932

© PDF: Kamunikat.org 2023 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023